16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 27 (5288) 19 ліпеня 2024 г.

ISSN 0024-4686

Дарога сыходзіць удалеч... стар. 5

Сімвал агульнай памяці стар. 6

Малады спрыт ды кураж стар. 14

Рэкордны, яркі, трыццаць трэці

Фота БелТА.

Гран-пры конкурсу выканаўцаў «Славянскага базару» заваявала малдаванка Караліна Балан.

У паўночнай сталіцы Беларусі адгучалі святочныя акорды XXXIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Сёлета на форум мастацтваў міжнароднага маштабу акрэдытавалася больш за сем тысяч удзельнікаў, канцэрты і мерапрыемствы наведалі больш за 80 тысяч чалавек, анлайн-трансляцыі фестывальных падзей паглядзелі 11 мільёнаў карыстальнікаў, а транспарт, які абслугоўваў «Базар», праехаў 120 тысяч кіламетраў — гэта тры разы вакол планеты.

Галоўнымі мерапрыемствамі валошкавага фестывалю з года ў год з'яўляюцца вакальныя конкурсы. Сёлета XXII Міжнародны дзіцячы музычны конкурс «Віцебск-2024» сабраў у горадзе на Дзвіне прадстаўнікоў 14 краін свету. Два дні юныя зорачкі змагаліся за галоўны прыз да апошняга, а канкрэтна — да цырымоніі ўрачыстага адкрыцця фестывалю — ніхто не ведаў, куды паедзе Гран-пры: ва Узбекістан ці Мальту, бо прадстаўніцы гэтых краін набралі аднолькавую колькасць балаў. У выніку Гран-пры 22-га дзіцячага музычнага конкурсу атрымала Ясміна Хуснiддзінава з Узбекістана, высокую ўзнагароду пераможцы ўручыў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. Беларусачка Злата Ярашэвіч атрымала трэцюю прэмію, а таксама спецпрыз Парламенцкага Сходу Саюзнай дзяржавы.

Працяг на стар. 4 ►

«ЛіМ»-акцэнты

Спадчына. Руіны кляштара бернардынак XVII стагоддзя закансервуюць. Пра гэта гаворыцца на сайце *sb.by* са спасылкай на Брэсцкі гарадскі выканаўчы камітэт. Руіны кляштара бернардынак — апошняе сведчанне сярэднявечнага Бярэсця, сёння гэта самы стары будынак тысячагадовага горада. Вядома, што кляштары бернардынцаў і бернардынак з касцёлам размяшчаліся ў Валынскім прадмесці. Будынак жаночага манастыра моцна пацярпеў у 1915 годзе. Касцёл выгарэў знутры — крыху пазней яго знеслі. Пасля Вялікай Айчыннай вайны будынак мужчынскага манастыра быў разабраны мясцовымі жыхарамі на цэглу. Кялейны корпус кляштара бернардынак ад разбурэння выратавала тое, што доўгі час яго выкарыстоўвалі савецкія вайскоўцы.

Навука. Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа 1 лістапада запрашае прыняць удзел у XXXVIII навуковай канферэнцыі «Каласавіны», прысвечанай 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 65-годдзю музея. Да ўдзелу запрашаюцца спецыялісты ў галіне коласазнаўства, гісторыі беларускай літаратуры XIX—XX стст., гісторыкі, архівісты, журналісты, культуролагі, спецыялісты музейнай справы. Тэмы канферэнцыі — творчасць Якуба Коласа ў літаратурным, духоўным і сацыякультурным кантэксце XX — пачатку XXI ст., коласазнаўства ў XXI ст., праблемы перакладаў спадчыны паэта, празаіка і публіцыста на мовы народаў свету, Якуб Колас і сучаснасць ды іншыя. Рабочыя мовы канферэнцыі — беларуская, руская, іншыя славянскія. Заяўку неабходна падаць не пазней за 14 кастрычніка.

Супрацоўніцтва. Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, Цэнтр беларускай драматургіі і Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа запрашаюць 21 жніўня на тэатралізаваныя чытанні ўрыўкаў з арыгінальнага варыянта паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка». Рэжысёрам выступае Алена Зміцер, за музыку адказвае Мірон Шарай. Ролі выконваюць Ігар Сідорчык, Дзяніс Аўхарэнка, Алесь Ніканенка, Юлія Лазоўская, Дзмітрый Давідовіч і Ганна Лебедзева. Чытанні адбудуцца ў вялікай гасцёўні музея Коласа. Сёлета паміж музеем і тэатрам было падпісана Пагадненне аб супрацоўніцтве. Тэатралізаваныя чытанні ўрыўкаў з паэмы «Сымон-музыка», 100-годдзе якой будзе адзначацца ў 2025 годзе, стануць першым сумесным праектам.

Музей. Днямі ў Нацыянальным мастацкім музеі пачаў працаваць музейна-часопісны праект «Арт-лекторый “Роднага слова”», прымеркаваны да 85-годдзя музея і прызначаны праз публікацыі ў часопісе папулярызаваць актуальныя даследаванні мастацтвазнаўцаў — супрацоўнікаў установы. Так, цяпер фармат праекта пашыраецца да лекцый у музеі. Адкрыла цыкл сустрэч лекцыя «Скульптура “Укрыжаванне з Галубічаў” са збору Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь: пытанне паходжання твора» вядучага навуковага супрацоўніка аддзела старажытнабеларускага мастацтва Станіслава Чавуса. Была разгледжана гісторыя гэтага твора, акрэслены комплекс звязаных з ім музейных прадметаў, на падставе чаго аўтар выказаў меркаванне пра сапраўдны рэгіён паходжання помніка.

Вернісаж. Тым часам у Мастацкім музеі адбылося ўрачыстае адкрыццё выстаўкі народнага мастака СССР Аляксандра Шылава. У экспазіцыі прадстаўлена звыш 30 жывапісных твораў майстра. «Творчасць вядомага жывапісца, Героя працы Расіі, народнага мастака СССР Аляксандра Максавіча Шылава заснавана на найлепшых традыцыях класічнага рэалістычнага мастацтва. У створанай мастаком партрэтнай галерэі сучаснікаў знайшла адлюстраванне складаная і разнастайная карціна духоўнага жыцця Расіі канца XX — пачатку XXI стагоддзя: народныя вострасацыяльныя вобразы, жаночыя вобразы, створаныя з жыццёвай дакладнасцю, глыбокай унутранай праўдай характараў», — адзначаюць у музеі.

● Мастацка-дакументальная выстаўка «Яўген Чырыкаў. На шляхах жыцця і творчасці», прысвечаная рускаму празаіку, драматургу, журналісту, адкрылася днямі ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча. «У фондах музея Максіма Багдановіча захоўваецца шмат матэрыялаў, што прама ці ўскосна звязаны з Яўгенам Чырыкавым, — лісты, дакументы, паштоўкі, кнігі, перыядычныя выданні. На працягу многіх гадоў супрацоўнікі музея сябруюць з нашчадкамі рускага пісьменніка, якія жывуць у розных краінах. На выстаўцы прэзентуюцца каштоўныя матэрыялы з архіва сям’і Чырыкавых, якія раскрываюць тэму жыцця пісьменніка ў Мінску, дадаюць штрыхі да ўмоўнага партрэта Мінска канца XIX — пачатку XX стагоддзя», — адзначаюць у музеі. Выстаўка «Яўген Чырыкаў. На шляхах жыцця і творчасці» будзе працаваць да 31 жніўня.

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Кнігі на форуме Беларусі і Расіі

На XI Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які праходзіў у Віцебску, Полацку і Наваполацку, Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна на адным з рабочых месцаў разгарнула выстаўку кніг беларускіх і расійскіх выдавецтваў, якія тэматычна звязаны з гуманітарнай, культурнай і літаратурнай інтэграцыяй нашых краін.

Высокія дзяржаўныя асобы, кіраўнікі абласцей Беларусі, рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі мелі магчымасць пазнаёміцца з серыяй выданняў лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», філакартыста, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзіміра Ліхадзедава «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага». Сабраўшы велізарную калекцыю старых паштовак, дасведчаны беларускі краязнаўца, публіцыст ажыццявіў многа праектаў супольна з расійскімі калекцыянерамі і публіцыстамі. Як вынік — альбомы «Блакада», «Палігон. Гісторыя Скобелеўскага ваеннага лагера», альбомы, прысвечаныя Першай сусветнай вайне, праваслаўным храмам Аляксандра Неўскага ў Беларусі, Расіі, а таксама ў іншых краінах свету. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Уладзімір Ліхадзедаў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны. Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі адзначыў Уладзіміра Аляксеевіча ордэнам Дружбы. Нядаўна прынята і рашэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы аб узнагароджанні беларускага калекцыянера і пісьменніка Прэміяй Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

На выстаўцы, прысвечанай дружбе народаў Беларусі і Расіі, віцебскія бібліятэкары прадставілі і шэраг сумесных кніг Уладзіміра Ліхадзедава і Алеся Карлюкевіча (у тым ліку і расповед пра лёсы расійскіх пісьменнікаў-франтавікоў на беларускіх прасторах у Вялікую Айчынную вайну — «Крыніцы памяці»), а таксама зборнік нарысаў, гутарак, эсэ А. Карлюкевіча «Адрасы рускай літаратуры ў Беларусі. Адрасы беларускай літаратуры ў Расіі», па старонках якога можна было ажыццявіць віртуальнае падарожжа ў Башкартастан, Татарстан, Кабардзіна-Балкарыю, Калмыкію, Удмурцію, Чачэнскую Рэспубліку, пазнаёміцца з многімі адрасамі літаратурнай памяці, адкрыць шырокую палітру сучасных беларуска-расійскіх літаратурных стасункаў.

Сяргей ШЫЧКО

У цэнтры Еўропы

Да Дня горада ў Полацку правялі VII літаратурны форум «Цэнтр Еўропы». У ім прынялі ўдзел члены Саюза пісьменнікаў Беларусі. Ганаровым старшынёй журы стала старшыня Віцебскага абласнога аддзялення СПБ Тамара Краснова-Гусачэнка. Сярод членаў журы — Аляксандр Раткевіч, які прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі мерапрыемства.

На сёлетнім форуме прысутнічаў расійскі паэт, празаік і публіцыст, галоўны рэдактар часопіса «Масква» Уладзіслаў Арцёмаў, які нарадзіўся ў Беларусі. А загадчыца аддзела паэзіі і прозы часопіса «Масква», паэтэса Наталля Баева актыўна працавала ў складзе журы.

Пераможцамі ў намінацыі «Паэзія» сталі У. Шалаеў, Ю. Панамарэнка, Т. Кавалёва, у намінацыі «Малая проза» — В. Палубінскі, Г. Сініцкі, С. Красаў, у намінацыі «Сябе ў баі не пашкадаваў, а Радзіму збярог» — Н. Якушава, М. Барынаў, К. Петрушэнка. У катэгорыі «Мовай Купалы і Коласа» былі выбраны творы Н. Момлік, В. Куца, Р. Цітава, а ў намінацыі «Паэт-артыст» перамог В. Пашута. Дадатковымі заахвочвальнымі дыпломамі ўзнагароджаны многія іншыя аўтары. Так, Мікалай Хахлоў атрымаў дыплом за вялікую патрыятычную і даследчую працу пры напісанні кніг пра Вялікую Айчынную вайну. На ўрачыстым адкрыцці ён быў узнагароджаны Ганаровай граматай Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Два дні ў Цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Ф. Скарыны Полацка гучала паэзія, праходзілі творчыя конкурсы, адбывалася ўручэнне ўзнагарод і прызоў.

Бездакорная арганізацыя мерапрыемства, як адзначыла Т. Краснова-Гусачэнка, была забяспечана дзякуючы намесніку старшыні Полацкага райвыканкама С. Валюшкінай, начальніку аддзела культуры Полацкага райвыканкама А. Астапавай, дырэктару Полацкай РЦБС А. Пацалуйкінай-Урублеўскай, намесніку дырэктара Полацкай РЦБС А. Бондараву.

Прэс-служба Віцебскага абласнога аддзялення СПБ

праекты

Што прынеслі... вятры

У рамках Фэсту вулічнага мастацтва «На сямі вятрах», што праходзіў у рамках «Славянскага базару», у дворыку Віцебскага цэнтра сучаснага мастацтва на Талстога, 7 сваю аўтарскую паэзію прадставілі 20 літаратараў. Гэта члены Саюзаў пісьменнікаў Беларусі і Расіі, ужо вядомыя аўтары і проста аматары.

Усіх прысутных аб’яднала любоў да творчасці і жаданне падзяліцца ёй з іншымі. Пляцоўка Фэсту вулічнага мастацтва «На сямі вятрах» як мага лепш падышла для гэтага. Яна працавала ўсе 4 дні.

Адкрыла пляцоўку старшыня Віцебскага абласнога аддзялення СПБ Тамара Краснова-Гусачэнка, абвясціўшы тэму чытанняў: «На славу жыцця, шчасця і кахання». Першы фестывальны дзень паэты прысвяцілі 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Прэс-служба Віцебскага абласнога аддзялення СПБ

Невычэрпнасць фальклору

Працягваецца шэраг канцэртаў па суботах у Аляксандраўскім скверы ў Мінску. 13 ліпеня перад жыхарамі і гасцямі сталіцы выступіў Беларускі дзяржаўны акадэмічны заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі» пад кіраўніцтвам народнай артысткі Беларусі Валянціны Гаявой.

У ансамбль «Харошкі» ўваходзяць танцавальная і вакальна-інструментальная групы. У арсенале аркестра ёсць класічныя і сучасныя музычныя інструменты: кларнет, флейта, баян, гармонік, альт, скрыпка і іншыя. Непаўторны нацыянальны каларыт гучанню аркестра надаюць ліра, жалейкі, кмены. Дзякуючы «Харошкам» старажытныя танцы атрымалі новае жыццё, захаваўшы сапраўдную народнасць і непаўторную прыгажосць.

Гледачам дэманструюцца некалькі пастаянных праграм: «Полацкі сшытак», «Местачковыя малюнкі», «Беларусы» і іншыя, якія адлюстроўваюць сцэны і характары з народнага жыцця ў яркіх танцах.

Эла ДЗВІНСКАЯ, фота аўтара

акцыі

Калі слова — набат

Паэтычнае слова ў якасці даніны памяці тым, хто змагаўся супраць фашызму і сталі яго ахвярамі, гучала на Ваўкавышчыне падчас акцыі «Пад мірным небам Беларусі». Яе правялі члены Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі і Гродзенскага літаратурнага аб'яднання «Надзея». Паэты чыталі вершы каля помнікаў піянерам і камсамольцам-падпольшчыкам у вёсцы Карпаўцы і на месцы спаленай фашыстамі вёскі Шавулічы.

У Карпаўку прыехалі дзеці з летняга аздараўленчага лагера СШ № 5 г. Ваўкавыска. Юных слухачоў найбольш уразіў верш Святланы Глямбоцкай «"Яблоки" под фуфайкой». Гэты твор яна прысвяціла подзвігу сваёй свекрыві Марыі Мікандраўны Міхеевай, у дзявоцтве Жыгачовай, дачцэ камандзіра заставы, якая была сувязной партызанскага атрада. На возе ў кошыку яна перавозіла звычайныя кіслыя яблыкі, а на сабе пад фуфайкай — «яблыкі» з выбуховым рэчывам.

Людміла Кебіч і Людміла Шаўчэнка падзяліліся творамі, напісанымі паводле ўспамінаў сваіх бацькоў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Дзмітрый Радзівончык прачытаў не толькі свае вершы, але і творы Мікалая Іваноўскага, які жыве ў Ваўкавыскім раёне і нядаўна выдаў паэтычны зборнік «Адгалоскі саракавых». Крануў і ўрывак з нарыса Станіслава Вішнеўскага «Тэрмінова патрэбна сувязь», які ён напісаў пра сваю родную цётку, педагога Вольгу Васільеўну Волах (Яфіменка). Падчас вайны яна была тэлефаністкай і ўдзельнічала ў вызваленні Ваўкавыска.

Тамара МАЗУР
Фота даслана аўтарам

Вершы чытае Людміла Кебіч.

між іншым

Са слязамі на вачах

Падчас правядзення «Славянскага базару» на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа ў Віцебску прайшлі «Тэатральныя сустрэчы».

Адной з устаноў культуры, якія прынялі ўдзел у ім, стаў Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Віцебчанам і гасцям горада купалаўцы паказалі свой прем'ерны спектакль «А зоры тут ціхія», створаны да 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Ён паспеў стаць адным з любімых гледачоў, якія нястомна дзеляцца сваімі прыемнымі ўражаннямі ад прагляду. Эмацыянальная і тонкая пастаноўка, якая расказвае пра лёсы пяці дзяўчат-зенітчыц і іх камандзіра старшыны Васкова, кранае да глыбіні душы.

Сцэна са спектакля «А зоры тут ціхія».

Сваімі разважаннямі аб спектаклі дзеліцца Ганна Мешчаракова, выканаўца ролі Жэні Камяльковай:

«Гэты спектакль для мяне важны, ён прасякнуты безумоўнай, бясконцай любоўю. Кожны ўдзельнік, кожны выканаўца неверагодна моцна яго любіць. Мы вельмі трапятліва да яго ставімся, колькі б разоў ні іграла, і нам хочацца паказваць яго зноў і зноў.

Мая роля шматгранная, неадназначная, складаная! Я вельмі доўга працавала над ёй, шмат чытала, вывучала, імкнулася зрабіць яе праўдзівай, шчырай. Вельмі спадзяюся, што ў мяне атрымалася. Выходзячы на сцэну, адчуваю, што пражываю жыццё Жэні Камяльковай. Яна такая завадная, такая яркая, нягледзячы на жудасныя падзеі, што адбыліся ў яе жыцці! То-бок трэба было стварыць такі вобраз, у якім бы ўсё гэта гарманічна сумясцілася, паказаць спалучэнне неспалучальнага.

Шчыра кажучы, кожны паказ спектакля выклікае слёзы на вачах, і гэта тычыцца не толькі мяне, але і іншых акцёраў, рэквізітараў, касцюмераў... Я бачу, як іх вочы напаўняюцца слязьмі, калі яны глядзяць з-за куліс на сцэну, колькі б разоў да таго ні бачылі спектакль. Рэжысёр Дзмітрый Акімаў стварыў неверагодны твор, на маю думку. І ў нас быў цудоўны мастак па святле Аляксандр Разанцаў, які зрабіў каласальную светлавую карціну. Уся каманда сабралася ў патрэбны час і ў патрэбным месцы, і вынікам стаў выдатны і бясконца любімы ўсімі спектакль, работай у якім неверагодна ганаруся.

Я бясконца рада, што нам далі магчымасць паехаць на "Славянскі базар" у Віцебск! Вялікі гонар, вялікая радасць стаць часткай фэсту».

Дар'я ТАЛАЛАЕВА
Фота даслана аўтарам

прэзентацыі

Цікава, бо не прыдумаеш

У Доме кнігі«Светач» адбылася прэзентацыя новай кнігі Дзмітрыя Нікалаева «Мая сяброўка Караліна». На сустрэчу завіталі вучні адной са школ горада Мінска. Дзеці ўважліва слухалі, адказвалі на пытанні выступоўцы і задавалі свае.

У адрозненне ад папярэдніх твораў Дзмітрыя Нікалаева «Мая сяброўка Караліна» напісана для больш дарослай аўдыторыі — дзяцей ад дванаццаці да чатырнаццаці гадоў. Гэтая гісторыя апавядае пра тыповыя падлеткавыя праблемы — першую закаханасць, стасункі з аднагодкамі і настаўнікамі, школьныя будні. Прататыпамі герояў твора сталі рэальныя людзі.

У гэтай гісторыі дзеці, якія толькі ўваходзяць у падлеткавы ўзрост, могуць пазнаць сябе. «Мая сяброўка Караліна», на думку аўтара, будзе больш цікавая дзяўчынкам. Аднак пісьменнік падзяліўся планамі аб напісанні падобнай падлеткавай гісторыі і для хлопчыкаў.

Падчас сустрэчы абмяркоўваліся цікавыя юным чытачам пытанні. Напрыклад, тэрміны напісання кніг і страх памылак. Школьнікі падзяліліся сваімі ідэямі для апавяданняў, расказалі пра крыніцы натхнення і агучылі любімыя тэмы. Пасля заканчэння прэзентацыі ўсе ахвотнікі атрымалі кнігу з аўтографам аўтара.

Дар'я АРХІПКАВА

фестывалі

Свята душы

VIII Міжнародны фестываль-конкурс «Сузор'е» прайшоў у Елані Валгаградскай вобласці. Амаль усе фіналісты конкурсу з Расіі і Беларусі з'ехаліся на мерапрыемства.

У дзень фестывалю ў Еланскім раённым цэнтры культуры сабраліся паэты і празаікі, музыканты і спевакі, народныя калектывы.

На суд гледачоў і журы былі прадстаўлены народныя і аўтарскія песні, вершы сучасных паэтаў. Поўная зала гледачоў апладзіравала кожнаму выступоўцу.

Тамара КАВАЛЬЧУК

«ЛіМ»-люстэрка

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага на фестывалі «Дні Дастаеўскага ў Опцінай пустыні», які праходзіў з 12 да 14 ліпеня ў Калужскай вобласці (Расійская Федэрацыя), прадставіў публіцы спектакль па рамане рускага класіка «Ідыёт». Паставіла гэты твор у 2023 годзе рэжысёр і вядучая актрыса Нацыянальнага тэатра Бялграда Івана Жыган. Як адзначыла Івана, паглядзець спектакль прыходзілі цэлымі сем'ямі. «І пасля першага дзеяння, і пасля другога зала доўга не адпускала артыстаў. Былі бурныя авацыі, гледачы падтрымлівалі артыстаў», — цытуе БелТА рэжысёра-пастаноўшчыка.

Міжнародны фестываль гістарычнай рэканструкцыі «Легендарныя эпохі» адбыўся ў Зэльве, інфармуе БелТА. На адкрыцці фестывалю прайшоў парад эпох. Для гасцей падрыхтавалі тэматычныя пляцоўкі. Асобнае месца ў праграме было адведзена тэме Вялікай Айчыннай вайны. Так, адбылася рэканструкцыя «Вызваленне Зэльвеншчыны савецкімі войскамі і партызанамі ў ліпені 1944 года». Падчас фестывалю працаваў шэраг інтэрактыўных пляцовак: музычна-літаратурны інтэрактыў беларускіх і расійскіх аўтараў «Спадчыннікі Перамогі», праграмы «Эпоха 1812» і «Эпоха мушкетаў XVII—XVIII стагоддзяў». Да таго ж у райцэнтры разгарнуліся партызанскі лагер і выстаўка тэхнікі часоў Вялікай Айчыннай вайны.

Фотавыстаўка «Вялікія людзі грамадзянскай авіяцыі» адкрылася ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск». Яна распавядае пра лёсы, дасягненні, гісторыі жыцця вялікіх савецкіх авіятараў, якія вызначылі сусветнае развіццё галіны. Экспазіцыя арганізавана пры падтрымцы прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь, урада Санкт-Пецярбурга, Камітэта па транспарце Санкт-Пецярбурга. Фотапраект «Вялікія людзі грамадзянскай авіяцыі» даступны кругласутачна на 3 паверсе ў зоне вылету, удакладняе БелТА.

Работы па рэстаўрацыі музея-сядзібы Л. М. Талстога ў Хамоўніках у Маскве завершацца ў лістападзе 2024 года. Пра гэта паведаміў «ИТАР-ТАСС» генеральны дырэктар Дзяржаўнага музея Л. Н. Талстога, у склад якога ўваходзіць музей-сядзіба пісьменніка, Уладзімір Талстой. Між тым пакуль невядома, калі ўстанова будзе адкрыта для наведвання, бо неабходны час, каб вярнуць рэчы, якія цяпер захоўваюцца ў розных падраздзяленнях Дзяржаўнага музея Талстога. Музей-сядзіба ў Хамоўніках размешчаны ў доме, дзе пісьменнік жыў у 1882—1901 гадах. Дарэчы, дом быў пабудаваны ў пачатку XIX стагоддзя, не згарэў пры пажары 1812 года, уцалеў у гады рэвалюцый і падчас авіяналётаў на Маскву ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Там Леў Талстой напісаў каля 100 твораў, у тым ліку раман «Уваскрэсенне», аповесці «Смерць Івана Ільіча» і «Крэйцарава саната».

Дзяржаўны Эрмітаж запусціў анлайн-праект аб фламандскім мастацтве, які з'яўляецца віртуальным гідам па выстаўцы «*Ars Vivendi*. Франс Снэйдэрс і фламандскі нацюрморт XVII стагоддзя», што адкрыта ў музеі да 8 верасня. Экспазіцыя аб'ядноўвае больш за 70 жывапісных палотнаў фламандскіх майстроў нацюрморта і аніміалістычнага жывапісу эпохі росквіту мастацтва Фландрыі ў XVII стагоддзі. На сайце праекта даступны відэа пра тое, як ствараліся экспазіцыя, пра яе гістарычны кантэкст і рэстаўрацыю некаторых карцін. Віртуальная экспазіцыя дазваляе наведаць залу з дапамогай панарамнага агляду, — гаворыцца ў сацыяльных сетках Эрмітажа.

Лаўрэат «Оскара», рэжысёр Эмеральд Фенэл, вядомая па стужках «Дзяўчына, якая падае надзеі» і «Солтбёрн», займаецца новым праектам — экранізацыяй адзінага рамана Эмілі Бронтэ «Навальнічны перавал». Кніга выйшла ў 1847 годзе і расказвае пра трагічнае каханне, якое прыводзіць да шматлікіх смерцяў. Раман дзясяткі разоў пераносілі на экран. Як гаворыцца на сайце *film.ru*, акцёрскі склад і дата рэлізу новай стужкі Эмеральд Фенэл не ўдакладняюцца. Яе «Солтбёрн» выйшаў у канцы 2023 года і атрымаў неадназначныя водгукі крытыкаў і гледачоў.

Зорка фільмаў «Дзюна» і «Вонка» Цімаці Шаламе выканае галоўную ролю ў будучым баёпіку «Марці Супрым», паведамляе *Variety*. Стужка раскажа пра знакамітага амерыканскага гульца ў настольны тэніс Марці Райзмане (1930—2012). За сваю працяглую кар'еру спартсмен выйграў 22 тытулы і некалькі бронзавых медалёў чэмпіянатаў свету. Прыхільнікі называлі яго «чараўніком настольнага тэніса». Рэжысёрам і суаўтарам сцэнарыя «Марці Супрым» выступіць Джош Сафдзі, які працаваў над праектам «Неаграненыя алмазы». Фільм спрадзюсуе і выпусціць на экраны студыя *A24*. Дакладная дата рэлізу невядомая. Акцёр Цімаці Шаламе нядаўна скончыў здымкі ў карціне «Дасканалы незнаёмец» пра спевака Боба Дзілана.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Рэкордны, яркі, трыццаць трэці

Конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск» — равеснік «Славянскага базару», ён таксама сёлета прайшоў 33-ці раз. Удзел у вакальным спаборніцтве ўзялі прадстаўнікі 15 краін свету, цікава, што канкурсант з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі ўпершыню прымаў удзел у фестывалі. У першы дзень ён выканаў хіт на рускай мове «Выйду ночью в поле с конём».

Вынікі конкурсу падвялі на цырымоніі закрыцця. Галоўны прыз — запаветную «Ліру» — атрымала Караліна Балан з Малдовы. Першую прэмію журы прысудзіла вакалісту з Казахстана Ерназару Жубану, другое месца занялі італьянка Мар'ям Танкрэдзі і расіянка Кацярына Кузіна. Беларус Валерый Чучман раздзяліў трэцяе месца з балгарскай канкурсанткай Нэвенэ Пяйковай, а таксама разам з прадстаўніцай Расіі Кацярынай Кузінай атрымаў спецпрыз Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Фота БелТА.

Валерый Чучман.

Дваццатая зорка на Алеі

Штогод арганізатары фестывалю да самага канца трымаюць у сакрэце, чыё імя з'явіцца на Алеі зорак каля Летняга амфітэатра. Імянную «зорку», або «валошку», закладваюць у гонар уладальніка прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення», які ўнёс значны ўклад у развіццё культуры Беларусі і Расіі. У гэтым годзе юбілейная, дваццатая, пліта з залацістай валошкай была прысвечана народнаму артысту Расіі, кампазітару і прадзюсару Рыгору Лепсу. Гэта стала для артыста своеасаблівым падарункам да дня нараджэння, які спявак адсвяткаваў 16 ліпеня. «Шчыры дзякуй! Для мяне гэта першая (наколькі я ведаю) зорка і, спадзяюся, не апошняя. Вялікі дзякуй беларускаму народу і яго культуры, усім, хто ацаніў па заслугах маю працу. Шчыры дзякуй Прэзідэнту Беларусі, я паважаю ваш народ і лічу яго брацкім, хаця сам з'яўляюся грузінам рускага паходжання. Усім вялікага шчасця, здароўя, усяго самага найлепшага, дабрабыту», — сказаў артыст падчас адкрыцця імянной зоркі.

З каларытам краін ШАС

У пачатку ліпеня наша краіна стала членам Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, і ўжо 12 ліпеня на «Славянскім базары» прайшоў першы ў гісторыі Беларусі Дзень нацыянальных культур краін — удзельніц ШАС. Мерапрыемства стартавала з сустрэчы міністраў культуры дзесяці краін, якія ўваходзяць у арганізацыю, дзе абмеркавалі варыянты супрацоўніцтва ў сферы культуры. Прыбыў у фестывальны Віцебск і генеральны сакратар ШАС Чжан Мін.

Пазней на плошчы Перамогі пачалася прэзентацыя нацыянальных культурных здабыткаў Беларусі, Расіі, Узбекістана, Таджыкістана, Пакістана, Кыргызстана, КНР, Казахстана, Ірана і Індыі. У адным вялікім выставачным павільёне дэманстравалі традыцыі свайго народа прадстаўнікі замежных дэлегацый. Краіны-ўдзельніцы таксама прывезлі ў паўночную сталіцу сваіх лепшых артыстаў, якія радавалі гледачоў музычнымі падарункамі. Тут жа, на плошчы Перамогі, усталявалі дрэва Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва, на якое па народнай беларускай традыцыі павязалі стужкі з назвамі краін-членаў, з'явіўся на плошчы і вялікі дыван з арнаментамі краін.

Ясміна Хуснідзінава. Фота БелТА.

80-годдзе вызвалення і юбілей «Песняроў»

Сёлета арганізатары форуму мастацтваў падрыхтавалі для жыхароў і гасцей культурнай сталіцы насычаную выставачную праграму, у якую ўвайшлі 13 буйных праектаў.

Асаблівым попытам у жыхароў і гасцей горада карысталася выстава «Уладзімір Мулявін. Спадчына вялікага маэстра», якую прывёз Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. Яна прысвечана 55-годдзю легендарнага ансамбля «Песняры».

Фота Аляксандры Гвоздзевай.

Дарэчы, калектыў яшчэ пры жыцці мастацкага кіраўніка Уладзіміра Мулявіна не прапускаў ніводнага «Славянскага базару», і цяпер фестываль цяжка ўявіць без народнага ВІА. Выставачны праект складаўся з інфармацыйна-графічнай і прадметнай часткі, апошняя была рэалізавана праз арыгінальныя эскізы сцэнічных касцюмаў, афішы, праграмкі, фатаграфіі, нотныя рукапісы і грампласцінкі, а таксама праз эскізы канцэртных касцюмаў і музычныя інструменты ўдзельнікаў ВІА.

Некалькі выставачных праектаў былі прысвечаны 225-годдзю з дня нараджэння рускага класіка Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна. Так, у віцебскай бібліятэцы імя паэта Пушкінскі запаведнік «Міхайлаўскае» запрашаў на інтэрактыўныя заняткі па гістарычным пісьме і віртуальную экскурсію па запаведніку. У фае канцэртнай залы «Віцебск» адкрылася выстава мастака Ігара Шаймарданава «А. С. Пушкін. Дзве зімы, два леты», а таксама прайшлі народныя рухавыя гульні пушкінскай пары «Куфар».

Чырвонай ніткай праз выставачную праграму форуму мастацтваў прайшла тэма 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі інфармацыйнае агенцтва і радыё *Sputnik* Беларусь прадставіла *VR*-рэканструкцыю «Невядомы сцяганосец», якая дазволіла перанесціся ў пачатак мая 1945 года, калі байцы Чырвонай Арміі штурмавалі берлінскі Рэйхстаг і ўзнімалі на яго даху чырвонае знамя Перамогі.

13 ліпеня ў фестывальны Віцебск прыбыла мабільная экспазіцыя Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны «Наш доўг — помніць!», якая знаёміла наведвальнікаў з гісторыяй вызвалення Беларусі праз унікальныя фотаздымкі, прадметы і асабістыя рэчы герояў вайны, муляжы ўзбраення байцоў ЧА. За першыя паўгадзіны работы перасоўнай экспазіцыі яе наведала больш за сто чалавек, цікавасць да праекта велізарная.

Дні Саюзнай дзяржавы і Дні моладзі

Традыцыйна на «Базары» праходзіць не адзін, а некалькі Дзён Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Сёлета народы нашых краін адзначаюць 25-годдзе са дня падпісання пагаднення аб утварэнні Саюзнай дзяржавы. У рамках фестывалю прайшоў шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных гэтай тэме. Упершыню на віцебскай сцэне прэзентавалі мюзікл «Казка пра цара Салтана», музыку да якога напісаў Аляксандр Зацэпін. На Пушкінскай плошчы праходзіў кірмаш раёнаў-пабрацімаў, а таксама канцэрт з удзелам лепшых мастацкіх калектываў Беларусі і Расіі. Увечары на сцэне Летняга амфітэатра адбыўся гала-канцэрт «Народнае брацтва даражэй за ўсякае багацце».

Дні моладзі на «Славянскім базары» стартавалі патрыятычным шэсцем «Марш вызваліцеляў». На працягу дня 12 ліпеня праходзіў нацыянальны фестываль-конкурс «Агонь маладзёжных талентаў», упершыню на базе ВДУ імя П. М. Машэрава адбыўся маладзёжны патрыятычны форум «Сям'я вызваліцеля», на якім прадстаўнікі органаў улады, актывісты, студэнты расказалі аб укладзе іх сем'яў у вызваленне нашай краіны.

Усе зоркі — у Віцебску

Канцэрты фестывалю наведалі больш за 80 тысяч чалавек. Многія з іх прыехалі ў паўночную сталіцу з Расіі на спецыяльным фестывальным цягніку. Якія ж зоркі сёлета дарылі сваю творчасць на форуме мастацтваў?

Упершыню быў рэалізаваны праект для падлеткаў «Госці з будучыні» з удзелам папулярных блогераў, маладзёжных выканаўцаў і лепшых юнацкіх творчых калектываў. Шасцітысячная зала спявала анлайн-хіты разам з Амірчыкам, Іванам Зданюком, Улькай Пулькай і іншымі.

Пасля доўгага перапынку вярнулася «Рок-панарама». Сёлета ў канцэрце ўзялі ўдзел праект «Гаршанёў», групы «*Skynet*», «*Cosa Nostra*», рускі трыб'ют «*Scorpions*» у суправаджэнні сімфанічнага аркестра Белтэлерадыёкампаніі. На адкрытай пляцоўцы каля канцэртнай залы «Віцебск» выступілі *Burito*, *Filatov&Karas*, Арцём Качар у рамках праграмы «Рытмы лета». Упершыню пасля ўрачыстага адкрыцця фестывалю свята працягнулася на танцпляцоўцы з «Душэўным радыё». Праграма не абышлася без упадабанага гледачамі канцэрта «Залаты хіт», на які сёлета завіталі Чылі, групы «Вінтаж», «Дыскамафія», «Вірус» і іншыя. З аншлагам прайшоў апошні фестывальны канцэрт «Шансон ТБ — усе зоркі».

На свае сольныя канцэрты запрашалі Ані Лорак, Яраслаў Сумішэўскі, Любоў Успенская, Алег Газманаў, Вікторыя Алешка, Марыям Мярабава. Трэці раз прыхільнікаў гумару сабраў КВЗ-канцэрт, у якім узялі ўдзел каманды «Доктар Хаусс», «Раісы», «Равенькі», «Трыёд і Дыёд», «Горад Магас». Кубак «Славянскага базару» забралі ў Іркуцк «Раісы».

Напрыканцы

Усе падзеі, якімі быў насычаны гэты яркі фестывальны тыдзень, не могуць змясціцца тут. Кожнаму жыхару не толькі нашай дзяржавы, але і ўсіх краін планеты, якія любяць творчасць і атмасферу адзінства, варта хаця б на дзень зазірнуць на «Славянскі базар». Паверце, такога каларыту вы больш не ўбачыце нідзе. А пакуль мы развітваемся да наступнага ліпеня, да 34-га форуму мастацтваў.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА

Фота БелТА.

Міністр культуры Беларусі Анатоль Маркевіч, генеральны сакратар ШАС Чжан Мін і намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка.

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Забыты фільм і яго героі

У снежні 1924 года было створана Беларускае дзяржаўнае ўпраўленне па справах кінематаграфіі (Белдзяржкіно), якое займалася пракатам фільмаў. З 1925-га пачалася вытворчасць уласных кінафільмаў. Паколькі ў Мінску вытворчай базы не было, у Ленінградзе арганізавалі студыю «Савецкая Беларусь», якая выпусціла ў 1925-м два першыя асветніцкія ці, як іх называлі, «культфільмы»: «Меліярацыя ў БССР» і «У здаровым целе — здаровы дух». За пяць гадоў на рахунку кінастудыі было 32 хранікальныя выпускі і 38 хранікальных і навукова-папулярных фільмаў. Студыя размяшчалася ў Ленінградзе, атрымаўшы для здымачнага павільёна залу былога Пецярбургскага дваранскага сходу на канале Грыбаедава.

У сакавіку 1925 года Аддзел прапаганды і агітацыі ЦК РКП(б) (Агітпрап) звярнуўся да Саўнаркама Беларусі з просьбай выдзеліць крэдыт для вытворчасці некалькіх мастацкіх фільмаў на беларускую тэматыку. Думаю, гэта была ініцыятыва ўраджэнца Гродзенскай губерні, тагачаснага супрацоўніка Агітпрапа Якава Якаўлева-Эпштэйна, які пасля стаў наркамам земляробства.

Крэдыт быў дадзены, зняты тры фільмы. Меркавалася, што яны будуць пра барацьбу з царскім самадзяржаўем і польскімі акупантамі.

Першым мастацкім фільмам стала кінастужка «Лясная быль», пастаўленая рэжысёрам Юрыем Тарычам паводле аповесці Міхася Чарота «Свінапас». Міхась Чарот быў у той час рэдактарам газеты «Савецкая Беларусь». Гісторыя стварэння фільма даволі цікавая, але гэта асобная размова.

Анонс фільма.

Аснова сцэнарыя — аповесць пра юнага разведчыка, былога падпаска Грышку, які разам са сваёй сяброўкай, дачкой лесніка Гелькай, дапамагае беларускім партызанам змагацца з ворагамі. Фільм меркавалася выпусціць да пяцігоддзя вызвалення рэспублікі, але ўдалося яго закончыць толькі ў канцы 1926 года.

Другі мастацкі фільм — кінастужка «Яго правасхадзіцельства» (1928), трэці — «Кастусь Каліноўскі» (1928, рэжысёр В. Гардзін). На трэцім фільме спыняцца не будзем; тым больш, што, як высветлілася, і Каліноўскі не зусім наш герой. Але варта, мусіць, успомніць, што Гардзін, адзін з самых вядомых акцёраў і рэжысёраў рускага дарэвалюцыйнага кіно, паставіў яшчэ фільм пра паўстанне кітайскіх працоўных у Кантоне ў 1927 годзе — «Чатырыста мільёнаў» (1928).

А нямы фільм «Яго правасхадзіцельства», які меў вялікі поспех, быў аднойчы пакладзены на паліцу і забыты. Быццам яго і не было.

Фільм заснаваны на рэальнай падзеі: 5 мая 1902 года рабочы-шавец Гірш Лекерт, член яўрэйскай партыі Бунд, учыніў замах на віленскага губернатара фон Валя.

Сцэнарый фільма такі. Гарадскі камітэт сацыял-дэмакратычнай партыі прымае рашэнне аб правядзенні першамайскай дэманстрацыі. Гірш Лекерт і яго таварышы раскідваюць лістоўкі з заклікамі да яе ў цырку, які часта наведвае фон Валь. Угневаны губернатар патрабуе даставіць да яго ўплывовых прадстаўнікоў яўрэйскай абшчыны. Лемзер, казённы рабін, абяцае «абрынуць закон ізраіляў на галовы падбухторшчыкаў». Народ збіраецца на дэманстрацыю. Жонка Гірша Рывель спрабуе адгаварыць мужа. Стары рабін праклінае сваю прыёмную дачку Мірыям за тое, што яна сустракаецца з рускім сацыял-дэмакратам Пятром. Фон Валь аддае загад разагнаць дэманстрацыю. Многіх арыштоўваюць. Некалькі чалавек забіта. Сярод арыштаваных шмат яўрэяў, у тым ліку і Мірыям. У яўрэйскіх дамах і сінагогах моляцца, баючыся пагрому. Старога рабіна ўгаворваюць пайсці да губернатара прасіць за арыштаваных. Але той усё ж загадвае вылупцаваць іх. Лекерт прапануе забіць фон Валя і, нягледзячы на пярэчанні таварышаў, страляе ў яго з рэвальвера. Губернатар паранены. Лекерт збіты і арыштаваны. Ён адмаўляецца прасіць аб памілаванні. Яго караюць смерцю.

У архівах Фільмафонду стужка ўсё ж захавалася, хаця і без першай часткі. Фільм можна знайсці ў інтэрнэце.

Рабочая назва — «Губернатар і шавец». Рэжысёр — тады яшчэ малады Рыгор Рашаль, ураджэнец Навазыбкава, сцэнарыст — яго жонка Вера Строева. Мастак фільма Ісаак Махліс, асістэнт па мантажы — яшчэ нікому не вядомы Марк Данской. У ролях М. Сінельнікава (Мірыям), Т. Адэльхейм (Рывель), А. Сандэль (фабрыкант Шпіс), А. Грынфельд (Лемзер), М. Растоўцаў (маленькі клоўн), М. Чаркасаў (высокі клоўн), А. Нянюкоў [Няшокаў] (Пётр), М. Даброва («зорка» цырка).

Ролю губернатара і старога рабіна выконваў вядомы артыст МХАТа Леанід Леанідаў-Вольфензон (1873—1941). Ролю Лекерта — непрафесійны акцёр, рабочы Юлій Унцершлак.

Натурныя здымкі праходзілі ў Оршы.

Сцэнарый напісаны Верай Строевай на аснове матэрыялаў актывіста Бунда Цадзека Даўгапольскага, ураджэнца Гарадка Віцебскай губерні, які пісаў на ідыш, аўтара апавяданняў, нарысаў і камедый, некаторыя з іх ілюстраваны вядомым мастаком Эль Лісіцкім.

Што ж там, у Вільні, адбылося?

У буйных цэнтрах — губернскіх і павятовых гарадах — яўрэйскае насельніцтва складала больш за палову ўсіх жыхароў (у сярэднім — 59,4%). Па дадзеных 1897 года ў Магілёве пражывала 21 547 яўрэяў (што складала 50% усяго насельніцтва), у Віцебску — 34 440 яўрэяў (52%), у Мінску — 47 562 (52%), у Гомелі — 20 385 (55%), у Брэсце — 30 260 (65%), у Пінску — 21 065 (74%). Першыя чыста яўрэйскія гурткі з'явіліся ў Мінску яшчэ ў 1883 годзе. У канцы XIX стагоддзя яўрэі складалі больш за 40% удзельнікаў рознага роду антыўрадавых выступленняў у Расійскай імперыі, уяўляючы сабой сапраўдную «крытычную масу рускага рэвалюцыйнага руху». Гурткі пад кіраўніцтвам

яўрэйскіх сацыял-дэмакратаў існавалі практычна ва ўсіх гарадах і мястэчках Беларусі, Літвы і Польшчы. У кастрычніку 1897 года ў Вільні прайшоў іх з'езд, на якім утварыўся «Усеагульны яўрэйскі працоўны саюз у Літве, Польшчы і Расіі» (Бунд). Меркавалася, што Цэнтральны камітэт арганізацыі будзе размяшчацца ў Мінску, але I з'езд РСДРП, які прайшоў тут у сакавіку наступнага года, прывёў да арышту ў розных гарадах больш за 70 членаў Бунда, разгрому яго цэнтральнай друкарні ў Бабруйску і разрыву многіх ужо наладжаных сувязяў. Пасля гэтага ЦК Бунда пачаў працаваць у Вільні і цягам чатырох наступных гадоў правёў яшчэ тры з'езды. Моўны бар'ер доўгі час рабіў Бунд самай заканспіраванай рэвалюцыйнай арганізацыяй у Расіі.

Прызначаны губернатарам Віленскай губерні Віктар фон Валь у 1863-1864 гадах прымаў актыўны ўдзел у падаўленні польскага паўстання, падчас якога вылучыўся асабістай мужнасцю і рашучасцю, за што атрымаў шэраг баявых узнагарод. З 1878 да 1892 года ён узначальваў пяць губерняў — Гродзенскую, Харкаўскую, Падольскую, Валынскую, Курскую, а з 1892 да 1895 года займаў пасаду пецярбургскага граданачальніка.

Прыбыўшы ў Вільню, ён загадаў правесці арышты актывістаў забастовак сярод працоўных Вільні і Смаргоні, што адразу прынесла яму рэпутацыю «сатрапа». 28 арыштаваных дэманстрантаў (22 яўрэі і 6 палякаў) былі жорстка пакараны.

«Свіст розаг характарызуе цяперашні наш палітычны парадак непараўнальна лепш, чым мог бы характарызаваць яго гром стрэлаў, — пісала бальшавіцкая газета "Искра". — Лупцоўка — пакаранне, прыдуманае для рабоў, — паказвае, што самадзяржаўе цара... азначае ў той жа час поўнае рабства пралетарыяту».

Расправа над дэманстрантамі выклікала ўсплёск абурэння ў яўрэйскім асяроддзі і прывяла да замаху на фон Валя, які быў ажыццёўлены вечарам 5 мая 1902 года Гіршам Лекертам. Яму ўдалося ў цырку двума стрэламі параніць губернатара, пасля чаго быў затрыманы паліцыяй і публікай. У гуртках 23-гадовы Лекерт быў вядомы як прапагандыст сярод яўрэйскіх рабочых і рамеснікаў у гарадах Віленскай і Віцебскай губерняў і Кацярынаславе, а ў 1900 годзе ўзначальваў нападзенне паўтысячы яўрэяў-рамеснікаў на паліцэйскі ўчастак у Навагародскім прадмесці Вільні.

Гірша Лекерта ваенна-палявы суд прыгаварыў да павешання.

У фільме пададзена, што Лекерт з'яўляецца сябрам нейкага марксісцкага гуртка ці партыі, але не гаворыцца што гэта Бунд. Наадварот, інтэрнацыянальнае сяброўства адлюстравана ў рамантычных адносінах яўрэйскай дзяўчыны і маладога рускага рэвалюцыянера Пятра. Ёсць і праславутая класавасць: канфлікт яўрэйскай рэвалюцыйнай моладзі з артадаксальнымі яўрэямі-багацеямі. Цітры ў канцы фільма абвяшчаюць: «Шэсць рэвальверных стрэлаў рэвалюцыі не робяць».

Першай ластаўкай гераізацыі Лекерта сталі артыкулы М. Рафеса ў часопісе «Красный архив» — «Апавяданне пра царскія розгі» і «Гірш Лекерт і яго замах». Гэта была, так бы мовіць, адмашка. Потым з'явілася паэма-п'еса на ідыш «Гірш Лекерт» Арона Кушнірава (1890—1949), перакладзеная на рускую мову Эдуардам Багрыцкім. Яна і ў пачатку 1930-х яшчэ працягвала ісці ў пастаноўцы Беларускага дзяржаўнага яўрэйскага тэатра.

У тэатры Морыса Шварца на Другой авеню ў Нью-Ёрку, затым у Маскоўскім яўрэйскім тэатры-студыі «Фрайнкуст» была пастаўлена драма былога бундаўца, ураджэнца беларускага мястэчка Ігумен, які пазней натуралізаваўся ў амерыканца, Левіка Гальперна (1988—1962) «Хірш Лекерт». Аўтар, між іншым, вядомы сваёй драматычнай паэмай «Голем» (1921).

У дваццатыя ўгодкі пакарання смерцю Лекерта ў яго гонар па савецкай краіне пранеслася хваля перайменаванняў вуліц, пасёлкаў і ўстаноў. Імем Лекерта сталі называць клубы і бібліятэкі, адзін з першых калгасаў Біраібіджана. Яўрэйскае паселішча ў Крыме, заснаванае ў канцы 1920-х, атрымала назву Лекерт, цяпер яно Румшына. У 1925 годзе выхадцы з Ноўгарада арганізавалі ў Херсонскай губерні калгас імя Лекерта. Днепрапятроўскае сяло Працалюбаўка да 1946 года называлася Лекерт, уваходзіла ў Сталіндорфскі яўрэйскі нацыянальны раён. Дзіцячы дом у Марыупалі насіў яго імя. У вуліцу Лекерта перайменавана знакамітая Вялікая Арнаўцкая ў Адэсе, названа вуліца ў Омску, у Віцебску і Таржку — абутковыя фабрыкі, бо Лекерт быў шаўцом. Да 1985-га імя Лекерта насіла вуліца ва ўкраінскім Нікалаеве. У 1922 годзе мінскія Ніжне-Ляхаўскія вуліцы (імя Варашылава, цяпер Кастрычніцкая, Ульянаўская і адна зніклая) таксама перайменаваны ў яго гонар. Імем Лекерта ў Мінску быў названы саўгас, у раёне вуліцы Людамонцкай (Мельнікайтэ). Вуліцы Лекерта з'явіліся ў Віцебску (былая Траецкая), Бабруйску (замест Сямёнаўскай), у Мазыры (былая Мікалаеўская).

У Смілавічах завулак Лекерта існуе да гэтага часу.

У 1927 годзе ў Мінску ствараецца Камісія па ўвекавечанні памяці Гірша Лекерта — «да 25-годдзя подзвігу», якую ўзначаліў Самуіл Агурскі, сам былы бундавец, адзін з арганізатараў Яўрэйскага рабочага інстытута ў Чыкага, які ўзначальваў у 1924—1929 гг. Камісію па гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі і РКП(б) (Іспарт) ЦК кампартыі Беларусі. Дзень пакарання Лекерта прапаноўвалася адзначыць у Беларусі мітынгамі і сходамі. Больш за тое, быў аб'яўлены конкурс на стварэнне помніка герою і выдзелена на гэта 10 тысяч рублёў. Неўзабаве манумент, створаны скульптарам Абрамам Бразерам, аўтарам помніка швейцарскаму педагогу І. Песталоцы ў Віцебску (1920), быў устаноўлены на былой Саборнай плошчы Мінска — там заставаўся п'едэстал статуі Аляксандра II. У 1937-м помнік знік, яго месца заняў фантан з фігурай стралка-лучніка. Пасля тут зноў узвялі будынак гарадской ратушы.

У пачатку 1930-х п'еса А. Кушнірова «Гірш Лекерт» яшчэ ішла ў пастаноўцы Беларускага дзяржаўнага яўрэйскага тэатра (БЕЛГАСЕТ), але ў 1934-м яе знялі з рэпертуару.

Падчас «барацьбы з касмапалітызмам» імя Лекерта было сцёрта з гісторыі рэвалюцыйнага руху. Толькі ў 1956 годзе выйшла паўаўтабіяграфічная кніга Аляксандры Брунштэйн «Дарога сыходзіць у далеч», дзе віленскі шавец паўстае ў ролі рэвалюцыянера.

Пятро КОШАЛЬ
Масква

«Нёман» успамінае і нагадвае

Неяк мяне папрасілі адзначыць наймацнейшыя бакі часопіса «Нёман». Гэта было ў вуснай гутарцы, але я задумалася: сапраўды, аглядаю часопіс амаль год і магу падзяліцца пэўнымі ўражаннямі. Я адказала тады свайму суразмоўцу, што самае каштоўнае для мяне — гэта гісторыка-патрыятычная тэматыка часопіса: у кожным нумары публікуюцца творы, якія так ці інакш закранаюць тэму гістарычнай памяці нацыі, Вялікай Айчыннай вайны, канцэнтруючыся на асабістым вопыце людзей, якія перажылі тыя складаныя часы (успаміны, перапіска) або мастацка адаптаваным у родава-жанравай прыродзе літаратурнай дзейнасці (аповесці, апавяданні, цыклы нарысаў). Важна, што аўтары пазбягаюць ура-патрыятычных шаблонных тэм, ваенную прозу часопіса адрозніваe псіхалагізм, натуралізм у традыцыйным разуменні — як адлюстраванне побыту і ладу жыцця людзей, прыніжаных абставінамі і абражаных ворагам. Урэшце, выразна выяўленае аўтарскае «я» з дапамогай лірычных адступленняў, эмацыянальна-псіхалагічных каментарыяў, адсылак да мінулага ўласнай сям'і ці роду.

Усё гэта мы знаходзім і ва ўрыўках з рамана Аляксандра Асіноўскага «Падлеткі ваенных гадоў», што надрукаваны ў пятым нумары часопіса. Дні нараджэння галоўнага героя — бясстрашнага хлопчыка Сашы — яго сем, восем, дзевяць гадоў прыпадаюць на розныя этапы жыцця яго сям'і ў ліхія гады Вялікай Айчыннай вайны: яе пачатак, потым знаходжанне ў нацысцкім лагеры, затым на сельгасработах на чужыне, нарэшце, год Вялікай Перамогі. «Дыялектыка душы» героя праяўляецца ў тым, як ён сталее разам з Радзімай, мяняецца, мужнее, зазнае страты і гора, маленькія і вялікія радасці. Аляксандру Асіноўскаму ўдалося накласці дадзены прыём («дыялектыка душы»), выкарыстаны Л. М. Талстым у яго трылогіі «Дзяцінства. Малалецтва. Юнацтва», на рэаліі ваеннага часу XX стагоддзя. Сімвалам сталення душы беларускага хлопчыка з'яўляецца хлеб — яго крошкі, пах, цеплыня — як самы каштоўны падарунак, які можа атрымаць галоднае дзіця ў ваенныя гады.

Ірына Карнаухава ў апавяданні «Валюшка», прысвечаным яе маці, працягвае тэму дзяцей на вайне. Дзесяцігадовая Валюшка пасля смерці бабулі застаецца адна за гаспадыню ў доме і выхоўвае малодшых братоў. Вернецца з вайны бацька, знойдуцца старэйшыя браты, раскіданыя па дарогах вайны, але ніколі не будзе ранейшым жыццё — без мамы, без бабулі, без дзяцінства.

Твор Людмілы Маркоўскай «Пражэктаршчыцы», прызнаюся, для мяне стаў поўным адкрыццём: упершыню я звярнула ўвагу на подзвіг жанчын, якія высвечвалі варожыя самалёты: «Што трэба для таго, каб пражэктар асвятліў самалёт? Трэба ведаць, куды ён ляціць. Для гэтага ёсць слухачы. Гэта яны дадуць вам курс і вугал месца, куды свяціць. Ад начальніка станцыі атрымліваеце каманду: "Прамень!" — і тут пачынаецца ваша праца. Наводзіце пражэктар, чапляеце самалёт і перадаяце яго па ланцужку ў зоны дзеяння знішчальнай авіяцыі і зенітных войскаў. Дзве станцыі-шукальнікі павінны, не губляючы ні долі секунды, асвятляць самалёт працаўніка да знішчэння…» Важна, што героі апавядання маюць рэальных прататыпаў, якія ўдзельнічалі ў абароне Баку, у знакамітай пражэктарнай атацы на Берлін. «Але да 1960-х гадоў нікога з прататыпаў гэтага апавядання ўжо не было ў жывых з-за апраменьвання: у пражэктарах знаходзіўся ўран».

Рэквіемам гучыць цыкл вершаў Андрэя Душачкіна «Да твару мужчынам ордэны» (творы «Абеліскі», «Цішыня», «Я без вестак прапаў…» і інш.).

Минута молчания
Скорбью и болью молчит...
Как обожженная нота
В памяти сердца звучит.

«Минута молчания»

Ваенную тэматыку падхоплівае Змітрок Марозаў у вершы «Апошні салдат», лірычны герой якога — салдат Перамогі, які ціха дажывае свой век. І здаецца маладым сучаснікам, што няма ў яго ніякіх клопатаў — і пенсія, і цёплая кватэра, і хлеба заўсёды ўдосталь:

А и правда — заботы немного
Схоронившему всех старику.
И одна лишь надежда — на Бога
На отпущенном Богом веку.

Астатнія вершы цыкла адлюстроўваюць роздумы паэта над сэнсам жыцця, аўтар шчыра дзеліцца перажываннямі. Расказвае пра свой шлях да Бога. І ўсё гэта на фоне летняга ручая, пад майскі шолах бяроз і паэтычны дыялог з любімым аўтарам Максімам Багдановічам і яго Веранікай.



О чем поет родник хрустальный,
Опалый пестуя листок —
Не знаю, ведь и сам я — тайна,
Что разгадает только Бог.

«Тайное»

Адна з не надта распаўсюджаных тэм, якія хвалююць сучасных пісьменнікаў — рэальнае жыццё сучаснага чалавека, пачынаючы з 1990-х гадоў. Пісаць аб мінулым з яго гераізмам і героямі, настальгіраваць па слаўных часах прасцей: і вобразаў шмат, і матэрыялаў дастаткова — адкрываюцца архівы, выносяцца на паверхню раней не вядомыя факты. Другі папулярны кірунак — фантастычны (фэнтэзі, фантастычны дэтэктыў) — гэта таксама адыход ад рэчаіснаці, палёт фантазіі адносіць усё далей ад праблем як аўтара, так і чытача. Тым складаней знайсці героя сённяшняга дня, і, мне думаецца, гэта актуальная задача для сучасных аўтараў — шукаць герояў сярод звычайных людзей. Як, напрыклад, гэта зрабіў Уладзімір Цанунін у рамане «Бежанцы», урывак з якога друкуецца ў майскім нумары. Героі — сельскія настаўнікі Змітрок і яго жонка Святлана, якія, уцякаючы ад радыяцыі, пасяліліся ў невялікай вёсачцы каля Белавежскай пушчы. Чытанне рамана — як глыток свежага паветра для прыхільнікаў класічнай літаратуры.

Тут і апісанне юнацкай закаханасці, і немудрагелістый побыт з яго рамантыкай, і сустрэчы героя з жыхарамі пушчы — кабаном і рысссю. Змітрок вядзе запісы-назіранні за жывёламі і птушкамі пушчы, запісвае мясцовыя легенды пра Дуб Ягайлы, Юркаў Груд, будуе з сынам шпакоўню, любуецца світанкамі.

Гэтым летам, кінуўшы ўсё, узяўшы адгул на працы, нечакана для сына я купіла білеты — і мы паехалі ў Белавежскую пушчу! Каталіся на веласіпедах, кармілі жывёл, елі чарніцы. Таму мне як нікому блізкія і зразумелыя радкі з рамана Уладзіміра Цануніна: «Когда солнышко над Беловежей поднимается выше, травы <…> вспыхивают цветами, над которыми непрерывным хороводом кружатся бабочки и стрекозы. Из камышей над Немержанкой выглядывают серые цапли, а на купинах греют свои сверкающие чёрные тела ужи. Это почти нетронутый уголок природы, подобие которому трудно отыскать в окружающем мире, а встреча с ним останется в памяти на всю жизнь».

Пейзажная лірыка як адлюстраванне прыгажосці беларускай прыроды займае пачэснае месца ў творчасці Наталлі Саветнай: вершы «Каштанавыя свечкі», «Раскідаліся па полі доўга-тонкія цені…», «Чаплі». Тэма роду прадстаўлена вершамі «Тату», «Бабулі маёй». Пранізліва, з ноткамі экзарцызму гучаць радкі «О, род гэты гідкі..»: у праведным гневе на сілы пекла лірычная гераіня заклікае сілы Святла да абароны сваёй душы і сваёй радзімы.

Но Кто-то бережно и ласково
(Кому дано с небес взирать)
К нам в души, не всегда прекрасные,
Впустил святую благодать!

«С ума сойти от этой нежности»

Паэме «Званы Хатыні» Міхаіла Хонінава папярэднічае нарыс старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алеся Карлюкевіча, прысвечаны калмыцкаму паэту і празаіку, які партызаніў у Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, сябраваў з беларускімі паэтамі. Для мяне асабіста падобныя публікацыі не проста даніна памяці сяброўству народаў, але, што важней, — сімвал агульнай памяці перамогі над нацызмам.

Вновь мир на земле,
а Хатыни той нет,
Вновь мир на земле, и покоя все нет.
Где семьдесят пять тех
сожженных детей?
Где двадцать шесть мирных
хатынских семей?

Таццяна СІДАРАВА

з пошты «ЛіМа»

Славілі не раз паэты…

Наколькі дазваляюць магчымасці зазіраць у кніжныя крамы, стараюся сярод старых кніг знайсці калектыўныя, анталагічныя зборнікі. Ходзіць у школу ўнучка — і часам пытаецца парады, які верш на тую ці іншую тэму прачытаць на вечары ці якім іншым мерапрыемстве.

І вось нядаўна натрапіў на такі зборнік — «Паэты свету пра Беларусь». 232 старонкі вершаваных твораў пра нашу Айчыну. Аўтары — Аляксандр Твардоўскі, Аляксандр Пракоф'еў, Міхаіл Ісакоўскі, Яраслаў Смелякоў і яшчэ 70 (!) паэтаў. Вось дзе сапраўдны інтэрнацыяналізм, сапраўдная дружба народаў! І гэта ж вершы, якія пісаліся не наўмысна на нейкі конкурс, па заданні! У кнізе — творы, якія нарадзіліся ад сардэчных, эмацыянальных перажыванняў пры сустрэчы з Беларуссю. Рэй вялі паэты Расіі, Украіны, Казахстана, Узбекістана, Туркменіі, Малдавіі, Арменіі, Латвіі, Літвы, асобна вылучаны рэспублікі Расіі — Бурацыя, Калмыкія, Паўднёвая Асеція, Татарыя, Чувашыя, Чачэна-Інгушэція. У кнізе — вершы мастакоў слова Балгарыі, Венгрыі, ГДР, Польшчы, Чэхаславакіі, Англіі, Аўстраліі, Італіі, Японіі. «Якая ціша ў беларускім лесе! // Аж дваццаць год // Ніяк не зможа ён // Зялёнай цішынёю наталіцца. // Узносяцца яліны-ветэраны. // Прыслухайся — // Пачуеш думкі. // Ля іхніх ног // Так рупіць разгуляцца дрэўцам // Няўрымслівым, як маладосць сама. // Ды назірае строга цішыня — // Прыглушана смяецца маладняк зялёны. // Не ведае нічога ён // Пра чорны грукат дзён мінулых, // Таму, дурненькі, прагне шуму…» (Емеліян Букаў, пераклад Рыгора Барадуліна).

Кніга выйшла ў мінскім выдавецтве «Беларусь» у 1968 годзе. Мяне ўразіў тыраж — 12 000 асобнікаў. Уступнае слова напісаў народны паэт Беларусі Петрусь Броўка… «Нам радасна, што сёння на твае гасцінныя прасторы, як да святыні, прыходзіць шмат пасланцоў свету, каб пакланіцца неўміручай славе тваёй…»

Я абавязкова параіў бы сённяшнім школьнікам і іх настаўнікам пагартаць гэты светлы і міралюбівы зборнік вершаў «Паэты свету пра Беларусь», кнігу, дзе яркія словы любові да нашай трывалай у любых драматычных выпрабаваннях Беларусі гавораць казах Сырбай Маўленаў, туркмен Рухі Аліеў, узбек Назармат, татарын Закі Нуры, калмык Міхаіл Хонінаў… Некаторыя з аўтараў ваявалі ў Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Як, напрыклад, рускі паэт Марк Максімаў (1918 — 1986), які партызаніў на Беларусі ў складзе атрада імя «Трынаццаці» пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза Сяргея Грышына. Альбо Міхаіл Хонінаў і Закі Нуры…

А выдаўцоў хацелася б папрасіць паболей перавыдаваць падобнага характару зборнікі. Упэўнены, што ў іх склад можна дадаць і вершы пра чуласць і павагу да Беларусі, напісаныя і ў пазнейшыя часы, а таксама і сёння…

Максім ПРАНОВІЧ,
Навагрудак, Гродзенская вобласць

Цэлы воз дзівос

Толькі пазнаёміўся з чарговай кнігай Казіміра Камейшы «Вёсачка на колах», выпушчанай выдавецтвам «Мастацкая літаратура» і адрасаванай дзецям малодшага школьнага ўзросту, як на памяць прыйшла песня Алеся Ставера на словы Ігара Лучанка: «Каб любіць Беларусь нашу мілую, // Трэба ў розных краях пабываць. // Разумею цяпер, чаму з выраю // Жураўлі на Палессе ляцяць. // Што ім тыя пагоды паўднёвыя! // Што ім пышны платанавы рай, // Калі клічуць іх далі сасновыя // І азёрны рабінавы край». Сапраўды: якімі б прывабнымі ні былі заморскія далягляды, але нічога лепшага на свеце няма, чым тое, што звязана з роднай Беларуссю.

Прадчуваю, што чытач можа здзівіцца: «Што гэта так, сумнявацца не даводзіцца. Але пры чым у дадзеным выпадку Казімір Вікенцьевіч з яго чарговай кнігай?» Такое параўнанне ўзнікла па асацыяцыі. Шмат хто з пісьменнікаў, дзіцячых не ў апошнюю чаргу, піша ў жанрах, якія прыйшлі ў беларускую літаратуру з-за мяжы. У гэтых розных, умоўна кажучы, фэнтэзі, шмат хто дасягае поспеху. Ды мне, «старамоднаму» усё ж вельмі блізкія тыя з іх, што з'яўляюцца традыцыйнымі. Асабліва, калі гэта адрасавана дзеткам. Пацвярджэнне таму і кніжка «Вёсачка на колах». Лепшыя творы яе, калі прытрымлівацца зместу, нібыта нічога і не адкрываюць. Ды гэта, як у добрай гаспадыні. Канешне, важна згатаваць пэўную страву, аднак не менш істотна, як яе падаць. Вершы Казіміра Вікенцьевіча — лішні доказ таму. Пачынаючы з таго, які і даў назву зборніку.

Вёсачка, пра якую апавядаецца, у нечым нагадвае тыя, што можна напаткаць сёння. Некаторыя іх жыхары не спяшаюцца жыць у гмахах, падобных на гарадскія, а селяцца ў жытле, якое, хоць і з усімі выгодамі, нічым не адрозніваецца ад таго, якое будавалася раней. А што гэтая вёсачка на колах… У вершы, як і ў некаторых іншых, Казімір Камейша ў якасці апавядальніка не сам выступае, а прамаўляе вуснамі каго-небудзь з дзяцей. А яны, як відаць па змесце, не толькі ўмеюць заўважыць тое, што іх акружае, але і здатныя на фантазію. А паколькі ім яе не займаць, то і з'яўляюцца нечаканыя параўнанні. У дадзеным выпадку — гэта цягнік, які складаецца з «вёсачкі вагонаў»:

Набярэ цягнік разгону,
А цяжар — як пацягнуць.
Едзе вёсачка вагонаў,
Так падобных на вясну.

Цягнецца шнурочкам доўгім
Паміж летаў, паміж зім.
Вунь і мой зялёны домік
Едзе следам за тваім.

Бадай, няма выданняў для дзяцей, асабліва паэтычных, на старонках якіх не прысутнічалі б звяры ці птушкі, якімі малеча захапляецца і ведае пра іх нямала гісторый. Некаторыя з гэтых персанажаў прадстаўлены і ў новай кніжцы Казіміра Вікенцьевіча. Хоць хлопчыкам і дзяўчынкам яны добра знаёмыя, апавядаючы пра іх, ён не паўтараецца. Абавязкова знаходзіць штосьці такое, чаго ў іншых аўтараў не напаткаеш. Як у вершы «Хітры кот». Ён нечым і знаёмы: «то заскочыць ён у бот», «то прытворыцца, што спіць, // Змоўкне нечакана. // Ну а сам на збан глядзіць, // Чуе там смятану». А такое далёка не пра кожнага ката скажаш, толькі пра хітруна з хітруноў:

Тата цэлы дзень злаваў,
Браўся за папружку —
Тапкі таты кот схаваў
Маме пад падушку.

Калі б згаданая страфа была ў вершы апошняй, ён, безумоўна, і так прагучаў бы. Толькі Казімір Камейша не абмежаваўся такой канстатацыяй. Партрэт «Хітрага ката» атрымаўся больш поўным дзякуючы такому завяршэнню твора: «Кот не можа без прыгод, — // Штось парве, паломіць. // Ловіць момант хітры кот, // А мышэй не ловіць».

Нечаканае завяршэнне і ў вершы «Коле заяц дровы». Стараннасці касавокага застаецца пазайздросціць: «Сам, // Без памагатых. // Ах, які шчырун! // Гахае заўзята / З-за пляча калун». Не адстае ад яго і зайчыха: « А зайчыха ў клетку // Роўна іх кладзе». Таму і стараюцца абое, бо «на зіму бярэцца, // Заінела шчэць. // Кожнае бярэмца // Будзе ўзімку грэць».

З гэтымі ляснымі насельнікам дзеткі сустрэнуцца і ў вершы «Зайцаў хлеб». Чым займаюцца, зразумела з назвы. Твор цікавы і тым, што прачытаўшы яго, хлопчыкі і дзяўчынкі даведаюцца, як з мукі з'яўляецца хлеб. Хай сабе і заячы, але хлеб ёсць хлеб: «Пераходзіла цеста, // У печ само бяжыць. // Яму даўно зацесна // У цёмнае дзяжы. // Стараецца зайчыха, каб ладны быў замес. // І бохан сам паціху // У печ з дзяжы палез».

Адзін з вершаў пра халодную пару года так і называецца — «Зімовы верш». Напісаны ён… самім зайцам. Зразумела, дзякуючы Казіміру Камейшу. А перадаў вершаскладанне гэтага ляснога жыхара так, што быццам увачавідкі бачыш, як завіхаецца ён. Не перад лістом паперы, а на снезе:

Лапкаю і гэтаю, і тою
Адбівае белы свой слядок.
Кіпцікамі, мяккаю пятою
Падганяе літары ў радок.
Піша і на пушчу косіць вочы,
Белым захліпаецца святлом.
Піша, як яму сягоння ноччу
На паляне весела было.

Па колькасці прадстаўленых у кнізе твораў пра зіму відавочна, што гэта любімая пара і самога паэта: «Снежны сон», «Як апранаецца зіма», «Мяцеліца», «Ласіная сцяжына». З гэтага шэрагу і «Коўзанка». Знаёмячыся з ім, хоць і даўно ўжо сталага веку, пераносішся ў даўні час, калі нёсся з гары, адчуваючы сябе… каўзуном. Толькі так, а не інакш, бо «Коўзанкавай гара завецца». Быццам і сам знаходзішся на ёй, імкнучыся хутчэй спусціцца: «Сябрукоў маіх тут шмат: // Янка, Косцік і Ігнат, // Лёня — мой старэйшы брат. // І сягоння ўсе яны // На гары той — каўзуны». А напрыканцы з'яўляецца нечаканае параўнанне: «Мчыць, куляе нас зіма. // І… куляецца сама».

Сімпатычным атрымаўся верш «Дзівосы». Як і ўсе творы ў гэтай кніжцы, канешне, для дзетак напісаны. Аднак і дарослы чытач будзе захапляцца тым, пра што апавядаецца, па-новаму адчуе вабнасць і паэтычнасць ўсяго, што нас атуляе. І толькі дарослыя зразумеюць, што верш гэты — сапраўдная паэзія. Яна немгчыма без умення пісаць пра тое, што для цябе нібыта і звыклае, так, што быццам бачыш яго ўпершыню.

Пачынаецца верш з таго, што «тата раніцай прывёз // З пушчы цэлы воз дзівос». Дачка Лена здзіўляецца: «— Дзе ж дзівосы? […] Усяго прывёз ён сена». Сапраўды, толькі сена ў ім:

А ў тым сене —
Паглядзі —
Звон вясёлы чуцен кос.
Нават пах яго адзін
Варты ўсіх зямных дзівос.

Далей — яшчэ больш дзівосаў: «А кульнулі сена на дол — // Стала светла навакол. // Ва ўсе дудачкі чмялі // Тут адразу загулі. // Скачуць конікі, стракозкі, // Апяваючы дакоскі. // Лёгка дзяцельнік дыміцца, // Цешыць мёдам медуніца».

Каб напісаць такое, трэба быць паэтам ад нараджэння. Ім і з'яўляецца Казімір Камейша. Дарэчы, ад яго ніколі не даводзілася чуць, што талент яму даў сам Усявышні. Ніколі не нагадвае, якія ўзнагароды мае. Перакананы, што пра любога пісьменніка лепш за ўсё гаворыць яго творы. У чым і пераконвае кніга «Вёсачка на колах».

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Бадай, няма выданняў для дзяцей, асабліва паэтычных, на старонках якіх не прысутнічалі б звяры ці птушкі, якімі малеча захапляецца і ведае пра іх нямала гісторый. Некаторыя з гэтых персанажаў прадстаўлены і ў новай кніжцы Казіміра Вікенцьевіча. Хоць хлопчыкам і дзяўчынкам яны добра знаёмыя, апавядаючы пра іх, ён не паўтараецца. Абавязкова знаходзіць штосьці такое, чаго ў іншых аўтараў не напаткаеш. Як у вершы «Хітры кот». Ён нечым і знаёмы: «то заскочыць ён у бот», «то прытворыцца, што спіць, // Змоўкне нечакана. // Ну а сам на збан глядзіць, // Чуе там смятану».

Чытацкі дзённік Навума Гальпяровіча

Ён зноўку тут

Часта ў памяці, бывае, усплываюць недзе чутыя мелодыі ці вершы, і доўга ходзіш потым пад іх уздзеяннем, і гучаць яны ўвушшу, як нейкае дзіўнае суправаджэнне ўласных думак і мрояў.

Так і гэтае:

Прысніўся верш — не верш,
а два радкі:
Абломак лодкі ўсплыў са дна ракі,
І кружыць вір счарнелую траву,
З абломкам лодкі к берагу плыву.
Прачнуўся… Дзень трывогаю прапах,
І два радкі гаркотай на губах.

І тады, калі прыходзіш дадому, рука цягнецца да зачытанага, цудоўна афармленага томіка «Мой свеце ясны» Міхася Стральцова, і прерагортваюцца старонкі, і ўчытваешся ў знаёмыя радкі, і ўспамінаеш сустрэчу з аўтарам у Полацку, яго хрыплаваты голас і тое дзіўнае адчуванне ўзаемаразумення, якое прыйшло з першай хвіліны знаёмства.

А зусім нядаўна да збору твораў Стральцова ў маёй бібліятэцы дадаўся невялікі том «Я зноўку тут» («Мастацкая літаратура») з серыі «100 вершаў» з цудоўным афармленнем Валерыя Шкарубы.

Пра гэтую серыю можна гаварыць асобна, бо ідэя ўвогуле выдатная — стварыць своеасаблівую анталогію лепшага, што ёсць ў айчыннай паэзіі. Але, на жаль, не ў кожнага, нават харошага паэта, знойдзецца менавіта сто вершаў на высокім узроўні.

Але пра кігу вершаў «Я зноўку тут»…

Увогуле, калі чытаеш Стральцова, міжволі згадваеш лепшыя ўзоры рускай, ды і сусветнай паэзіі. Гэта той выпадак, калі багаты духоўны свет аўтара аплоднены высокім густам, высокім інтэлектам, глыбокай філасафічнасцю:

Мне звышнадзённай тэмы не падняць,
Як не пазбыцца і лірычных трантаў.
Як барытону можна заспяваць
Напружана задзірыстым дыскантам?

Гэтыя «лірычныя транты» — сапраўдны ўзор высокага пачуцця і глыбіні думкі:

Пад шоргат кропель дажджавых
Ён з тэлефоннай будкі бачыў,
Як па галінах верхавых
Зялёны вецер пругка скача.
Ён наглядаў. Ён не спяшаў.
Нішто пагляд не абражала.
Як бы лячылася душа,
Яе як быццам суцяшала…

Паэт застаецца паэтам, нават калі ён піша прозу. Так і Стральцоў, напісаўшы выдатныя творы «Смаленне вепрука», «Адзін лапаць, адзін чунь», з чаго пачынаўся яго шлях у вялікую літаратуру, прыйшоў да вершаваных радкоў, якія найбольш глыбока выявілі душу, духоўны свет.

Мне б так сказаць: «Я здолеў заручыць
Сябе з уласнай думкай, і свой голас
Птушынай песняй здолеў надтачыць, —
Сабраў расу, якой умыўся колас».

Лепш, бадай, пра сутнасць творчасці паэта не скажаш.

Стральцова часам называюць песняром вёскі, згадваючы яго «Сена на асфальце», майстрам традыцыйнай тэмы.

Але, на мой погляд, ён далёка выходзіць за рамкі толькі гэтага азначэння. Не сельскі і не гарадскі ў дадзеным выпадку ён творца. Сапраўдная паэзія належыць сусвету без геаграфічнай прывязкі.

Такая паэзія, якую нам падарыў Міхась Стральцоў, — каштоўнейшы здабытак, за што можна толькі дзякаваць, што ён у нас ёсць.

А ў сваю чаргу варта падзякаваць выдавецтву і ўкладальніку — паэту Віктару Шніпу — за цудоўны падарунак усім аматарам сапраўднай паэзіі.

Ніна ГАЛІНОЎСКАЯ

Агеньчык памяці

Мой бацька сеяў, шыў і будаваў.
Любіў садзіць і дрэвы, і сады.
У трыццаць год матуля — удава.
Ляцяць з вайны «пялёсткі»
праз гады,
Спыняюцца ў яе на галаве.
Ад іх, калючых, галава баліць.
Як горка сёння слухаць удаве:
Зямлю імкнуцца нашу спапяліць.
Жыццё зямлі аплочана крывёй,
Слязамі ўдоў, сірот і мацярок.
Яно, як праўда, вечнае на ёй.
Мы — за жыццё,
за чысціню аблок.
Глядзіць матуля сцішана на нас:
Не паўтарылі б дзеці ўдовін лёс…
Агеньчык памяці загінулых не згас —
З гадамі павялічыўся, узрос.

Мае казкі

Гільзы, бляшанкі, каскі —
Цацкі дзяцінства майго.
Вельмі жахлівыя казкі
Помняцца з часу таго.

Доўгія і не па ўзросце
Казкі ваеннай пары!
Я іх баялася проста —
Марыла аб буквары.

Цьмяна газоўка блішчэла.
Маці скубла кудзелю,
Казка пра злога Кашчэя
Ў рытме з рукой ляцела.

Фашысты, нібы кашчэі,
Розум трывожылі ў сне.
Ранкам прасіла яшчэ я
Казку, але аб вясне…

Страшна дрыжэла хата,
Шыбы звінелі-гулі.
— Гоніць, дачушка, тата
Ворага з нашай зямлі.

Маці з пяшчотнаю ласкай
Гладзіла па галаве…
Маленства суровая казка
Ў памяці сёння жыве.

Дарункі дзецям

Прытамілася сонца. Ідзе на спачын.
Пад паветку сабраліся дзеці.
І задумліва-клопатна кожны маўчыць,
Цень трывогі на тварах не сцерці.

Так прайсці не магла. Узяла інтэрв'ю.
І адказы мяне ўскалыхнулі.
Кожны выказаў клопат і мару сваю —
Небяспеку малыя адчулі.

Закрануў іх таксама суровы наш час,
Уварваўся ў гульні, малюнкі.
Словы «бомбы», «вайна» —
у іх моўны запас,
А ім трэба ад сонца дарункі,
А ім трэба зямля ў аксаміце садоў,
А ім трэба жытнёвыя песні,
А ім трэба шчаслівыя ўсмешкі сяброў,
Неабдымны блакіт паднябесся.

Вы, забойцы-вар'яты, глядзіце часцей
На траву, скіньце чорныя маскі.
Ва ўсім свеце гучыць
заклік-просьба дзяцей:
— Не забудзьце пра нас, калі ласка!

Дзе б я ні быў…

Я дзеда знаю па партрэце.
Мой дзед загінуў на вайне.
Да абеліска кожным летам,
Здаецца, кліча ён мяне.

І я спяшаюся у поле
Да трох разгалістых бяроз.
Над абеліскам шэпча голле:
«Як ты, унучак мой, падрос!»

— Расказваў тата мне, дзядуля:
Ты біў фашыстаў пад Масквой.
І скавыталі злосна кулі
І дзень, і ноч над галавой.

Ты быў няўлоўны і бясстрашны.
Страчыў твой метка кулямёт,
Каб на зямлі на светлай нашай
Не пасяліўся фрыцаў зброд.

Ты гнаў іх смела да Берліна,
Туды, адкуль яны прыйшлі.
І тут цябе не засланіла
Ад куль вясна чужой зямлі.

І ты вось гэтым абеліскам
Прыйшоў на родную зямлю…
Перадаю паклонам нізкім
Пашану шчырую сваю.

Яшчэ сказаў мне сёння тата:
«Сынок, такім, як дзед, расці.
Твой дзед сумленным быў аратым
І справядлівым у жыцці».

Зямлі, што з любасцю араў ты,
Ніколі я не здраджу, не!
А калі стану касманаўтам,
Вяртацца буду да яе.

Дзе б я ні быў, сваёю справай
Ахоўваць буду мір, святло,
Каб век над нашаю дзяржавай
Не засланіла сонца зло.

Алена СТЭЛЬМАХ

Жыццё, сарванае з арэляў

Ноч спляла іх у вянок васількоў
і рамонкаў,
Усцешыла дурманлівым пахам зёлак,
Спакусіла мёднай асалодай,
Захапіла палётам арэляў
у бяздоннае шчасце…

У тыя імгненні незямнога хараства
З нябёсаў спусцілася мілосць —
Іх стала трое.
Неспадзеўна.
Нечакана.
Трое.

І апрануў дзень самую чорную вопратку —
Дваім ён прыкры, як і яны
Адно адному.
Трэці — лішні?
Вянок кваціты — растаптаны.
Смак ночы — горыч палыновая.
Жыццё, сарванае з арэляў…

А паміж імі — душа. Чуллівая.
Трапечацца, як свечка на ветры.
Няўжо не пусціць у белы свет?
Павек пакінуць з доляю бядовай?

Яна і Ён. Мільёны радасцей у свеце,
Спакусы лёсавых даброт.
Не чуюць толькі плач пад сэрцам
Анёлка — сведкі той чароўнай ночы…

Нулявы кіламетр

Ён датупаў да скрыжавання дарог —
Чарговы кіламетр…
Чарговая старонка…
Ногі, нібыта ватныя, прыраслі
Да сашморганай падэшвы
раскірэчаных чаравікаў.
Вачніцы пазіралі высахлымі азёрамі —
Быў конь, ды з'ездзіўся…

Вонкава было падобна: ён —
мармуровы помнік.
І толькі вецер перабіраў
Пасмы яго сівых валасоў —
Іграў на струнах прамінулых гадоў.

Груганамі мільгалі хуткія машыны.
Шэрымі вераб'інымі зграйкамі
снавалі людзі.
Яны адляталі ўдалеч,
быццам адарваныя старонкі
З прачытанай кнігі яго жыцця…

— Гэй, ты, стары валацуга,
Сыдзі прэч з дарогі!

Сігналы машын скаланалі наваколле,
Жоўтыя пагляды маланкамі
паласавалі паветра.
Лёс яго стрыножыў у гармідары
чалавечай юрлівасці.
Лагодная ўсмешка зацвярдзела
на яго парэпаных вуснах.

Нулявы кіламетр? Апошняя старонка?
Дачытаць яе трэба да канца.
Усё, што ён мог, —
бачыць іх сляпыя душы,
Што стрымгалоў імчаліся
за няўлоўным шчасцем.
Ад віску ашалелых тармазоў
У бясконцым небе знямела рэха…
Па празрыстым шкле разляцеліся
Калінава-барвовыя пырскі…

Вось і ўсё. Ён годна данёс свой крыж…
Як панясе свой крыж той,
Хто парашыў жыццё здарожанага
вандроўніка,
Хто дагнаў сваё няшчасце?

Памінальная малітва

Сад зіхацеў наліўным святлом.
Як ніколі.
Вецер-вірунчык танчыў на дыбках,
Каб не здрыгануўся ніводны лісточак.

Пракудзіў дождж —
даваў волю горкім слязам,
Аплакваючы апошнюю радасць
вясковага доўгажыхара.
Падпоры, расстаўленыя кімсьці
абачлівым,
Тырчэлі апіркамі знямоглага старца.

Асмужаныя яблыкі падалі ў траву.
Метраном адлічваў імгненні
да здзяйснення прысуду —
Урослыя карані жыўцом выдзеруць
з матухны-зямлі.
Сад аджыў сваё — вырашыў гаспадар
і прыгнаў ашчэраную машыну.

Грудастыя восеньскія хмары бліжэй
прыціскаліся да дрэў-пакутнікаў,
Каб увабраць у сябе іх нясцерпны боль.
Дрэвы разгатымі рукамі-галінамі
адчайна хапаліся за жыццё —
А яно не магло зачапіцца нават
за мізэрны карэньчык.

А з гары вясковых кладоў сад
па-ранейшаму квітнеў —
Тут знайшлі спачын тыя,
хто падзяляў з ім маладосць
І каму сад дарыў часцінку
жыццёвага смаку.
Зараз сад сыходзіў да іх, у вечнасць.

Могільнік раскірэчаных дрэў-калек,
Што нема просяць літасці ў нябёсаў,
Яшчэ доўга вярэдзіў душу чуллівага
мінака,
Пакуль памінальную малітву
не пракурлыкаў жураўліны клін…

Маўклівыя дзверы

Ён, пераскокваючы праз некалькі
прыступак,
Віхурай узняўся на трэці паверх.
Сцішылі вылупленыя вочы васьмёркі.
Восем — нумар кватэры, куды вёў яго лёс.

Букет прыціскаў да грудзей левай рукой,
Правая памкнулася да званка.
Чорная кнопка. Сумеўся.
Рука ў кішэні намацала пярсцёнак.

«Бывай, свабода!» —
бы абухом дало па галаве,
Фантанам пырснулі пракудлівыя думкі:
«Навошта ў пашпарце пячатка?
Як назаву яе маці?»

Паверхам вышэй бразнулі дзверы —
Нехта спускаўся ўніз.
Навошта сведкі?
Ён націснуў на чорную кнопку…

Яна, модная і прыгожая,
Нервова абмярала туфлікамі пакой.
На століку чырванела віно
і ружавеў п'янкі вінаград.
Званок — бы вецер страсянуў асіну.

Ключ адмыкаў замок.
А ці адамкне Ён Яе сэрца? Сумелася.
Ці той Ён, хто на ўсё жыццё?
Ці патрэбны заручальны пярсцёнак?

Яны не бачылі адно аднаго,
Але адчувалі гарачае дыханне,
Трапятанне сваіх сэрцаў.
Іх вусны жадалі пацалунка.
Паміж імі маўчалі дзверы.

Фота Кастуся Дробава.



Убачыць неверагоднае

Апавяданне

Вітаўт ЧАРОПКА

Часам адбываецца такое відавочна неверагоднае і таямнічае, што не паверыш сваім вачам і не можаш зразумець, бо ніхто не растлумачыць гэтую з'яву. Нават асцерагаешся расказаць, бо набалелае прызнанне могуць палічыць п'яным трызненнем і проста падняць на смех. Людзі заўсёды хварэюць на псіхоз незвычайнага. То ім раней бачыліся розныя там багі і крылатыя істоты — нябесныя пасланцы ўсявышніх, то яны сустракаліся з прывідамі, размаўлялі з душамі памерлых і г. д. Цяпер ужо модна вадзіцца з іншапланецянамі, якія сталі сапраўднымі гаспадарамі масавага псіхозу. Навукоўцы не могуць уцямна растлумачыць неверагодныя з'явы і падзеі, а то і проста адмоўчваюцца, маўляў, такога не бывае, бо такога не можа быць, а калі нешта і было, дык гэта падман, галюцынацыя і абы-што. Вось чаму неверагоднасць так палюбілася пісьменнікам. І яны апісваюць шмат самых-самых неверагодных, невідавочных, незразумелых, загадкавых і таямнічых выпадкаў, а збітаму з панталыку чытачу толькі застаецца верыць ці не верыць у напісанае. Старажытныя грэкі верылі ў гамераўскія паказкі аб цыклопах, сірэнах і іншых поскудзях, што вадзілі за нос няшчаснага Адысея на пакручастым шляху дадому. Значыць, сама рэчаіснасць нараджае неверагоднасць ці сама рэчаіснасць неверагодная, але мы ў сваёй звычайнасці не заўважаем яе, нават калі неверагоднае адбываецца з намі.

Я быў яшчэ ў тым узросце, калі жыццё захапляла мяне больш, чым літаратура, і з ахвотай здрадніка ўцякаў ад творчасці на розныя шумлівыя імпрэзы. Мой выпадак адбыўся напрыканцы 1990-х гадоў на Юр'я — старажытнае земляробчае свята, прысвечанае першаму выгану жывёлы на пашу. Пакаленне механічных людзей нічога не ведае пра яго, бо яму гэта абсалютна не патрэбна. Ладзіла імпрэзу невялічкая купка аматараў беларускага фальклору па ініцыятыве задорлівай і па-свойму таленавітай Валі Я., супрацоўніцы этнаграфічнага музея ў Строчыцах. Яна арганізавала, сабрала ўсіх знаёмых, запрасіла і мяне на пачэсную і адказную ролю самога Юр'я. Думаю, не за нейкія там звышзаслугі і таленты, а проста таму, што ў мяне была доўгая, амаль да пят ільняная сарочка, вышытая адметным арнаментам — Валін падарунак. У такой сарочцы, падпяразаны некалькі разоў вышываным паяском я сапраўды падыходзіў на ролю этнаграфічнага Юр'я. Уся мая роля зводзілася да таго, што павінен быў тройчы праехаць на кані вакол поля. Але замест каня мне дасталася кульгавая кляча, якая прывакла цягаць вазкі ці санкі і ніколі не была пад вершнікам, — адзінае што ўдалося знайсці ў мясцовых сялян. Мяне, яшчэ таго ездака, не засмуціла адсутнасць сядла і тое, што я намульваў задніцу аб яе кастлявы хрыбет, галоўнае — я ехаў. Сам дырэктар музея вёў клячу за аброць, а я, хоць і трымаў моцна лейцы, усё ж адчуваў сябе няёмка, баючыся зваліцца і сапсаваць урачыстасць свята. Асабліва, калі кляча заўпарцілася пры пераходзе праз багністы ручай. І мяне не слухалася, і дырэктара — спынілася, як аслупянелая, сярод ручаіны і стаіць. Спатрэбілася дапамога гаспадара клячы.

Калі нарэшце пужлівую жывёлу пераравялі праз ручай, мне засталося толькі сядзець на ёй, пакуль пад Юр'еўскія спевы дзяўчат яе тройчы не абвядуць вакол невялічкага лугу. А пасля ўсіх фальклорных урачыстасцяў удзельнікі збіраліся зладзіць звычайную п'янку на свежым паветры. Такое вось мадэрновае Юр'е! А пакуль я адчуваў сябе вясельным генералам, такім старэнькім, якому не ў радасць яго роля. Спачатку сум праганялі гімны Юр'ю, старажытнаму богу Ярылу, што спявалі маладымі галасамі дзяўчаты і маладухі, разадзетыя ў квяцістыя народныя строі. Юр'я, святы ключнік, адмыкаў зямлю, пускаў расу на ўсю вясну на кожны цвет, на увесь белы свет! Не столькі сакральнасць, колькі паэтычнасць падабалася мне. З гэтай наіўнай паэтычнасцю і пашанай да сваіх багоў і жылі нашы продкі тысячагоддзямі ў суладдзі са светам. І данеслі нам сваю жыццёвую энергію. Але неўзабаве і спевы надакучылі. Блукаючым позіркам я тужліва аглядаў наваколле: спарахнелыя хаткі мінулага, вятрак з вышчарбленымі ад часу крыламі, пачарнелая макаўка царквы. Усё гэта было ўжо несапраўдным, як і гэтае імправізаванае свята, — музейным. Адно добра — вясновае сонечнае святло, напоўненае свежым водарам маладых траў, якім так хораша дыхалася. І я ўбачыў яе…

Па вузкай сцежцы, што бегла сярод маладой травы ад прахалодных хваль Пцічы, ішла дзяўчына ў белай ільняной кашулі і спадніцы. Яна, здавалася, нават не ішла, а павольна плыла над зямлёй, злёгку дакранаючыся да яе далікатнымі ножкамі. Яшчэ адна ўдзельніца свята? Але я не бачыў яе сярод тых, хто прыехаў у аўтобусе сюды. Дык адкуль яна ўзялася? Здалёк бачыў на як галоўцы нешта падобнае на дыядэму, з якой па абодва бакі спускаліся на ланцужках колты. Я адразу адчуў нейкую блізкую повязь з гэтай таямнічай дзяўчынай і хоць не мог разгледзець яе твару, але ўявіў яго мілым і ясным, асветленым сінявой вачэй. Здавалася, у мяне анямее сэрца ад сонечнай прамяністасці яе позірку. Я з нецярпеннем чакаў заканчэння абраду. І калі нарэшце апынуўся на зямлі, дык інстынктыўна зірнуў на сцежку. Дзяўчына не падышла да ўдзельнікаў свята, а стаяла воддаль, метраў за сто, на адным месцы, нібыта баялася пераступіць забароненую мяжу паміж ёй і намі, паміж мінулым і будучыняй.

—Чаго ты ўсё туды вытарашчваешся? Свету блізкага не бачыў! — жартаўліва пад'юдзіла мяне Валя.

— Хто гэтая дзяўчына? — спытаўся я.

— Дзе? Якая? — шчыра здзівілася Валя.

— Вунь на сцежцы! — паказаў я рукой на белую постаць незнаёмкі, упэўнены, што Валя з-за звычайнай рэўнасці наўмысна не хоча яе заўважаць.

Валя яшчэ больш здзівілася, яе голас відавочна пасур'ёзнеў, калі не стаў раздражнёным.

— Дзе ты каго ўгледзеў? Я нікога не бачу.

— Ну як жа? Вунь, каля бярозкі стаіць… белая.

Цяпер ужо я здзіўляўся такой слепаце маёй сяброўкі. Ну як жа можна не бачыць амаль перад сабой белую постаць!

— Цябе сапраўды ўкалыхала, ці ўжо выпіў?

А я, не даслухаўшы, кінуўся да дзяўчыны, жадаючы ўзяць яе за руку і прывесці сюды, каб не дзічылася нас. І раптам сам аслупянеў.

— Нічога сабе! — гучна ўсклікнуў я, уражаны. Ды так, што ўсе азірнуліся на мой голас. — Я нічога не разумею!

Што адбывалася, я сапраўды не разумеў. Белая постаць, як у містычным кіно, пачала страчваць сваю выразнасць, рабіцца бляклай, аж пакуль не злілася з мройнай празрыстасцю паветра — і яе не стала, нібыта яна, сапраўды, была галюцынацыяй, маім хваравітым трызненнем, бачным толькі мне аднаму. Але я добра ўсведамляў, што гэта ніякае не насланнё на маю свядомасць. Дзяўчына была такой жа сапраўднай, як і сцежка, па якой яна ішла, як і бярозка, каля якой спынілася — яны не зніклі, а яна вось неверагодным чынам растала, як эфемернае стварэнне. У вачах яшчэ мігацелі зіхоткія блікі на яе колтах.

Гэта я цяпер столькі напісаў, а тады ўсё адбылося ў адно імгненне. Вось стаяла белая постаць — і раптам знікла, а замест яе ўспырхнула невялічкая шэрая птушка. Я зачаравана назіраў за яе імклівым палётам. Аднекуль з хмарных вышынь з трывожным карканнем зляцеў чорны крумкач. Птушка праляцела амаль над маёй галавой. Яна знізілася каля крайняй хаткі-старожкі, абляцела яе і зноў ірванула ў бок Пцічы, як да ратавальнай мяжы. Над ёй мільгануў чорны цень крумкача. Ва ўсім гэтым я ўбачыў нейкі патаемны сэнс, нібыта сама дзявочая душа прасіла маёй дапамогі, бо сёння менавіта я быў Юр'ем, старажытным богам Ярылам. Інстынктыўна я падаўся да старожкі, не зважаючы на здзіўленыя галасы ўдзельнікаў свята. Дзесьці ў куточку свядомасці мільганула думка, што трэба спыніцца і прагнаць насланнё, бо я ж не псіх, а нармальны чалавек. Вось менавіта таму, што быў нармальны, я не сумняваўся ў сапраўднасці белай дзяўчыны. Амаль над маёй галавой праляцеў чорны крумкач, аж здалося, што чыркнуў сваім пруткім крылом па валасах, а на яго кіпцюрастай лапцы бліснула халоднае жалеза пярсцёнка. Значыць, я не памыляўся — адбываецца нешта неверагоднае, у чым мне наканавана адыграць сваю адметную ролю.

Я хуценька дабег да старожкі і ўвайшоў у адчыненыя дзверы. Адразу ж схамянуўся ад нечага, што раптоўна ўзнялося з-пад маіх ног. Пранырлівая сарока, шумна лопаючы крыламі, села на стальніцу і бліскучай пацерачкай хітрага вочка скасавурылася на нечаканага незнаёмца. Апроч гэтай птушкі ў старожцы нікога не было. Вартаўнік, пэўна, пайшоў паглядзець на свята, пакінуўшы ручную сароку прыглядаць за старожкай. Ды нічога вартага я там не ўбачыў: стол, крэсла, тапчан... Але павінен быць нейкі сэнс у маім з'яўленні тут. Сарока па-ранейшаму насцярожана цікавала за мной.

— Прывітанне! — па-дурному сказаў я птушцы і пачуў у адказ раскацістае тра-р-р-р-р, маўляў, ідзі прэч адсюль, чужынец.

Але выходзіць я не збіраўся, бо сярод яе нервовай траскатні меладычна ціўкнуў салаўіны пошчак, які прагучаў з-за невялічкай печкі. Такі ціхі, як далёкая просьба аб ратаванні. І цяпер я ведаў, дзеля чаго тут, што павінен рабіць. Ад маёй рашучай хады сарока сарвалася са стальніцы і шуснула ў дзвярны праём, напаўняючы прастору сваім пранізлівым голасам, нібыта выклікала дапамогу. А ўслед гаркнуў крумкач, ды так злавесна, што мне зрабілася нядобра, нават падумалася: лепш уцячы са старожкі, каб чаго такога не здарылася... Толькі мая прыродная ўпартасць спыніла мяне. Сапраўды, за печкай стаяла накрытая чорным пакрывалам клетка, з якой чулася птушынае ціўканне. Там знаходзіўся маленькі вязень людской жорсткасці. Яго злавілі ў хітрае сіло і пасадзілі за краты, каб атрымліваць асалоду ад сумнага спеву. Я вынес клетку са старожкі, і ўзрадаваны салавейка сустрэў сонечнае святло гучным посвістам «Вітаю-ю-ю! Віта-ю-ю-ю!». Ізноў чорны цень крумкача мільгануў над маёй галавой. Але цяпер я не спалохаўся злавеснага вэрхалу, што ўсчаўся нада мной. Здавалася, што гэта сам вартаўнік ператварыўся ў крумкача і хоча адняць у мяне свайго пеўчага нявольніка ці перахапіць яго ў палёце і разрэзаць сваімі жалезнымі кіпцюрамі, каб спыніць яго веснавы спеў.

Трымаючы клетку ў руках, як дарагую ношу, я накіраваўся да людзей, якія здзіўлена назіралі за мной. Падбег нейкі чорны чалавечак і схапіў мяне за руку. «Куды нясеш клетку? Гэта мая птушка!» — залямантаваў ён. Здаецца, я паслаў яго, бо ён адступіўся. А можа, проста саступіў ініцыятыву дырэктару музея, які подбегам кінуўся да мяне. Яго заклапочаны суровы твар не палохаў, бо сам дырэктар, апрануты ў джынсы і вышыванку, падпярэзаную вышываным паяском, што гераічна трымаў тоўстае пуза аматара піва, нагадваў блазна. Ну як баяцца такога?! І на яго патрабаванне вярнуць вартаўніку «музейную маёмасць», я, стрымліваючы смех, адказаў, што па народнай традыцыі на Юр'е выпускаюць на волю птушак, а маёмасць — клетку — вярну. Ён хацеў выхапіць яе з маіх рук, але я пакруціў галавой і сказаў: «Не лезь». Да нас падыходзілі ўжо зацікаўленыя ўдзельнікі свята, дзеці радасна крычалі: «Пташка! Пташка!». «Вы не маеце права выпускаць птушку», — не сунімаўся дырэктар. «Вось я буду яшчэ пытацца. Традыцыя ёсць традыцыя». І тут «фальклорныя» дзяўчаты раптам заспявалі:

Маленькая пцічка
Высока лётае й —
Пад самага й Бога,
Пад Юр'я ж святога.

Святочна гучалі іх спевы, напаўняючы душы кранальнай ўрачыстасцю. Іх галасы ляцелі ў вясновае неба, разрывалі ўсялякія межы. Яны напаўнялі жыццё жыццём.

— Аддай, Юр'я, ключы
Замкнуць люту зіму,
Адамкнуць цёпла лета.

Дырэктар і вартаўнік сціхлі. І я ўрачыста, каб усе бачылі, падняў клетку над галавой і панёс яе, кіруючыся да запаветнай мяжы, за якой ужо ніякая чорная сіла не авалодае маленькім геніем вясны, чые спевы зачароўваюць майскія ночы. «Як усё прадумана», — сказаў нехта, шчыра прымаючы мой учынак за гульню па напісаным сцэнарыі.

На запаветнай мяжы, акурат каля бярозкі, я адчыніў клетку і, узяўшы птушку ў далонь, выпусціў яе на волю. Адпускаў з пяшчотным пачуццём, як адпускаюць каханую, ведаючы, што ўсё гэта недарэмна, бо ты даеш шчасце іншым, ахвяруючым сваім. У гэтым твая моц — парваць сілкі, каб даць волю вольным!

Усе шчаслива ўсміхаліся ўслед птушцы, пакуль яна не растала ўдалечыні. І ніхто не зразумеў, чаму я памахаў рукой, бо ніхто не ўбачыў дзве белыя постаці — дзяўчыну і юнака, якія, узяўшыся за рукі, стаялі на беразе ракі. Што ж, каму не дадзена ўбачыць неверагоднае, не дадзена ўбачыць і відавочнае… А я ўбачыў, у той дзень я быў Юр'ем, старадаўнім богам Ярылам.

Таямніцы не скончацца ніколі

130 гадоў таму ў газеце «Мінскі лісток» упершыню пабачыла свет ананімная паэма «Тарас на Парнасе», твор, ахутаны таямніцамі з самага пачатку свайго існавання і дагэтуль. І, здаецца, таямніцы яго не скончацца ніколі. Так склалася, што прафесійная, аўтарская беларуская літаратура бярэ пачатак ад двух твораў, аўтары якіх якраз-такі былі невядомыя. Ці думалі асобы, якія стваралі «Энеіду навыварат» і «Тараса на Парнасе», наколькі важнае значэнне адыграюць іх сачыненні ў айчыннай культуры?

Такім чынам, першай таямніцай стала аўтарства «Тараса…». І пратрымалася яна даволі доўга. Але выдатны навуковец, надзелены і немалым пісьменніцкім талентам, Генадзь Кісялёў, разгледзеўшы асобы і біяграфіі некалькіх прэтэндэнтаў-аўтараў, паказаў, што паэма «Тарас на Парнасе», хутчэй за ўсё, належыць пяру Канстанціна Вераніцына. Кніга Кісялёва, дзе падрабязна разглядаюцца ўсе крокі яго даследчыцкай працы «Жылі-былі класікі», чытаецца як захапляльны дэтэктыў.

Але канчаткова ставіць кропку ў пытанні аўтарства «Тараса на Парнасе», здаецца, яшчэ рана, бо ёсць навукоўцы, якія разглядаюць на ролю складальніка «Тараса…» іншых асоб. І іх аргументы таксама пераканаўчыя. І яны, несумненна, маюць рацыю.

Напрыклад, Ігар Запрудскі мяркуе, што аўтарам «Тараса…» можа быць Ялегі Пранціш Вуль (сапраўднае імя Элігій-Францішак Карафа-Корбут). Так, навуковец у адным з раздзелаў сваёй працы «Па дарозе на Парнас» заўважае, што «ўжо ў ранні перыяд творчасці індывідуальная манера будучага пісьменніка фарміравалася пад вызначальным уплывам сінтэзу беларускай народнай культуры і традыцый рускай прафесійнай паэзіі, спалучала краязнаўчую тэматыку, якая не ўяўляецца па-за патрыятычным кантэкстам, з шырокімі магчымасцямі мемуарнай формы выкладання. А гэта якраз тыя знешне разнародныя плыні, якія так бліскуча скантамінуюцца ў геніяльных творах — паэме "Тарас на Парнасе" і гутарцы "Два д'яблы". (Твор "Два д'яблы", верагодна, напісаны тым жа пісьменнікам, што і "Тарас на Парнасе")».

І сапраўды, за асобу Вуля кажа, напрыклад, тое, што быў ён добрым знаўцам рускай літаратуры, а яшчэ ж М. Багдановіч характарызаваў аўтара «Тараса…» як «чалавека рускай культуры», бо на подступах да Парнаса ён сустракае рускіх класікаў і двух вядомых удзельнікаў літаратурнага працэсу сярэдзіны XIX ст. (Грэча і Булгарына).

Асобу Я.П. Вуля не абмінуў і сам Г. Кісялёў, які адзначаў, што па маштабе таленту і сваіх мастацкіх густах якраз Э.-Ф. Карафа-Корбут падыходзіць на ролю аўтара «Тараса…».

Калі нават гэта і не Я.П. Вуль, дык, як заўважаюць некаторыя даследчыкі, паэма можа быць напісана і не адным К. Вераніцыным, а ў сааўтарстве з яго аднакашнікамі ці сябрамі, адным ці некалькімі.

Дарэчы, не толькі ў пытанні аўтарства паэмы рана ставіць канчатковую кропку, але і ў вызначэнні яе жанру. Даследчыкі выступаюць з рознымі меркаваннямі, і кожны з іх мае рацыю.

Больш за тое! Мы не можам быць на 100 % упэўнены і ў датаванні «Тараса…» Лічыцца, гэта 1855 год. Але і тут магчымы варыянты!

Аднойчы ўжо згаданы навуковец Ігар Запрудскі дзеля высвятлення лёсу Тараса звярнуўся да зорак і апісаў вынік у працы «"Тарас на Парнасе": праблема гісторыка-літаратурнага каментарыя». Падставай для яго разваг сталі радкі, у якіх даволі дакладна апісваюцца акалічнасці часавага адрэзку, калі разгортваецца дзеянне твора: «На самага Кузьму-Дзям'яна // Пайшоў я біць цецярукоў» і «Гляжу я: мусіць, ужо вечар, // Бо маладзік на неба ўзлез».

Сучасныя тэхналогіі дазваляюць разлічыць, у якія гады на канкрэтную дату прыпадае тая ці іншая фаза месяца, у якім сектары неба знаходзіліся тыя ці іншыя планеты Сонечнай сістэмы і г. д. Звычайна такія праграмы выкарыстоўваюць астролагі і аматары прадказання лёсу па зорках. Але ў нашым выпадку магчымасці яе выкарыстаў літаратуразнавец і атрымаў вельмі цікавыя вынікі.

«Паводле інфармацыі ў электронных рэсурсах у Беларусі маладзік на восеньскія Кузьму-Дзям'яна, ці 14 лістапада ўвечары можна было назіраць у наступныя гады — 1841, 1849(?), 1852, 1860, 1863(?), 1868(?). Цікава, што 14 лістапада 1852 года, а гэта была нядзеля, маладзік якраз толькі з'явіўся на вячэрнім небасхіле, нібы сапраўды "на неба ўзлез"».

Такім чынам атрымліваецца, што паэма магла быць напісана і раней. А ці магла пазней? Да гэтых разваг падштурхнулі імёны рэальных гістарычных асоб, пра якіх сказана ў творы.

Як мы памятаем, побач з антычнымі багамі (грэчаскімі і рымскімі ўперамешку), у паэме згадваюцца і рэальныя постаці: Пушкін, Лермантаў, Жукоўскі і Гогаль, якія «прайшлі як павы на Парнас», а таксама Фадзей Булгарын (Ян Тадэвуш Кшыштаў Булгарын) і Мікалай Грэч.

Амаль усе са згаданых асоб на момант напісання паэмы памерлі ўжо, акрамя нашага земляка Фадзея Булгарына, які сышоў з жыцця ў 1859 г. Такім чынам, калі паэма сапраўды пісалася недзе ў 1855 г., дык Булгарын, паводле тэксту, хацеў узлезці на Парнас яшчэ жывым!

Аднак, безумоўна, гэта зусім не доказ таго, што твор напісаны пазней за 1859 год, калі памёр апошні са згаданых на подступах да Парнаса рэальных персанажаў. У сярэдзіне XIX ст. не было яшчэ тэхналогій, якія дазвалялі б лёгка даведацца аб гадах жыцця і біяграфіях сваіх сучаснікаў, і аўтар «Тараса…» мог проста не ведаць, што Фадзей Булгарын на той свет для паэтаў прэтэндаваць не можа не толькі таму, што не паэт, але і таму, што дагэтуль жывы-здаровы ходзіць недзе па зямлі.

На сённяшні дзень паэму «Тарас на Парнасе» (як і многія іншыя творы айчыннай класікі) атачае вялікая колькасць надзвычай цікавых тэкстаў, бо многія даследчыкі вывучалі яе з розных ракурсаў.

Шматлікія даследаванні і новыя тэхналогіі, якія робяць для нас даступнымі неверагодную колькасць інфармацыі, як бачым, зусім не пазбавілі свет таямніц і загадак. Наадварот, вывучаючы іх, можна сутыкнуцца з новай таямніцай, адшукаць цікавы факт там, дзе ўжо і не чакаеш яго знайсці.

Марыя ШАМЯКІНА

з пошты «ЛіМа»

«З баявой выкладкай салдата...»

Цяжкі лёс суправаджае народы ўсю іх гісторыю. Гінуць людзі, знікаюць дзяржавы, застаецца памяць. Памяць пра жахлівыя падзеі. Тыя, хто вытрымліваюць такі цяжкі час, становяцца правадырамі сваіх народаў, расказваюць усім, як людзі змагаліся за права на існаванне з самой смерцю. Такім быў народны паэт Беларусі Аркадзь Куляшоў.

Аўтар верша «Маё пасведчанне» — паэт з самабытным голасам, з выразнай інтэлектуальнай скіраванасцю і са складаным лёсам. Прайшоўшы Вялікую Айчынную сапраўдным героем, сустрэўшыся з іншымі жыццёвымі выпрабаваннямі, пісьменнік захаваў свае ідэалы і пакінуў вялікую спадчыну: вершы, паэмы, пераклады. Аркадзь Куляшоў сябраваў з многімі савецкімі паэтамі. Яго цаніў Аляксандр Твардоўскі, якому беларускі літаратар прысвяціў паэму «Варшаўскі шлях». А сам Аляксандр Трыфанавіч пад уражаннем створанай Куляшовым у час вайны паэмы «Сцяг брыгады» напісаў знакаміты твор «Василий Тёркин».

Творчасць Аркадзя Куляшова фарміравалася пад уплывам падзей, што адбываліся ў краіне. У яго паэзіі духоўна ўзвышаецца вобраз чалавека, перакананага барацьбіта за высокія ідэалы. Прыкладам такога твора з'яўляецца аўтабіяграфічны верш «Маё пасведчанне», у якім паэт паказаў не толькі свой жыццёвы шлях, а і лёс дзясяткаў тысяч чалавек, народжаных у складаны час (гэта дапамагаюць зразумець і словы пісьменніка, абраныя ў якасці эпіграфа). Такім чынам, выразна бачым тэму твора — лёс свайго пакалення. Разам з Куляшовым падобныя пачуцці перажывалі Пятрусь Броўка, Уладзімір Дубоўка, Пімен Панчанка, Максім Танк.

Пачынаецца верш з прызнання аўтара, што выдаў «пасведчанне» ён сабе сам. 1914 год (год нараджэння паэта) быў пачаткам Першай сусветнай вайны, якая зрушыла людзей з месца, прымусіла падацца ў бежанцы. Не з «нянькамі» і «песнямі», а пад грукат кананады прайшло дзяцінства пісьменніка. Выкарыстоўваючы метафару («нянька няпрошаная людская») і ўвасабленне, Аркадзь Куляшоў расказвае, як вайна «клапацілася» пра людзей:

Думала вайна, як кананадай
Лепей ёй мяне закалыхаць;
Клапацілася, як лепш блакадай
Рукі мне і ногі спелянаць.

Узарваць, забіць, знішчыць — вось чаго хоча вайна-нянька. Яна дасягае сваіх мэт, на што аўтар указвае метафарай «шмат людзей вайной закалыхана», гэта значыць, што зладзейка ўсё ж знайшла спосаб знішчэння чалавека. І таму, каб спыніць гвалт і жах, што панавалі на зямлі, паэт рана (у 27 гадоў) адправіўся абараняць свой край: «Выйшаў я на бой смяротны рана».

Аркадзь Куляшоў з дапамогай рытарычных пытанняў падкрэслівае, што не аднойчы быў за крок ад смерці. Яго дачка ўспамінала, як паэт разам са знаёмым журналістам і выкладчыкам пад бомбамі шукалі ваенкамат, каб запісацца на фронт, але ўсе сталічныя ваенкаматы ўжо выехалі. Убачыўшы гэта, пісьменнік страціў прытомнасць. Гэта быў яго першы інфаркт. Сябры па няшчасці неслі яго барысаўскімі балотамі тры дні. Урэшце Куляшоў устаў на ногі, і яны дабраліся да Оршы, дзе яшчэ дзейнічаў прызыўны пункт. І не адзіная гэтая сітуацыя жахам адгукалася ў сэрцы паэта.

Пісьменнік расказвае, як цяжка было на вайне, праз якія нечалавечыя пакуты ён прайшоў: «Кожны дзень ішоў з агня ў агонь». І хоць прайшло ўжо шэсць гадоў, а творца ўсё памятае. І не забудзе ніколі! Аркадзь Куляшоў адзначае, што жыве ўжо даволі доўга — трыццаць сем гадоў, і кожны дзень абавязкова прыносіць нейкія выпрабаванні. Свой час паэт ахарактарызаваў метафарай «эпоха бур». Мастак не спыняецца, праходзіць праз усе іспыты свайго часу мужна, адважна, «з баявой выкладкай салдата». Перад суровым лёсам Куляшоў «не схіляецца пакорна», калі казаць словамі Петруся Броўкі.

З болем і сумам успамінае паэт сям'ю і свой бацькоўскі кут у Саматэвічах: «Колькі год мяне чакае хата, мой бацькоўскі кут, мая сям'я?» Па роднай Магілёўшчыне літаратара ў Вялікую Айчынную вайну двойчы пракаціўся смяротны каток ваеннай машыны. Пра падзеі тыя Аркадзь Аляксандравіч пісаў так прачула, мужна, дакладна і праўдзіва, што гэта прынесла яму поспех, прызнанне і вядомасць.

Кароткі момант сустрэчы з роднымі — і зноў у бой! «За мір і шчасце для людзей», — вось дзеля чаго жыве чалавек!

«У суровы век жыву сурова», — агучвае паэт свой дэвіз. Ён азначае, што чалавек павінен прыстасоўвацца да асяроддзя і часу, у якім ён жыве. Аркадзь Куляшоў падкрэслівае, што не змог бы жыць інакш, не прытрымліваючыся сваёй думкі. Вернасць ідэалам пацвярджае «слова» паэта — яго творы, якія нараджаліся ў жыццёвых перыпетыях. Менавіта таму яго вершы такія праўдзівыя, кранальныя, шчырыя.

Акрамя твораў літаратара, яго нялёгкі шлях пацвярджаюць лясы, гаці, сама Зямля, бо яны былі нямымі сведкамі тых жахлівых падзей, якія перажыў пісьменнік, калі праз тыя самыя лясы і гаці гнаў разам з Чырвонай арміяй немцаў і «круціў ботамі Зямлю», кажучы словамі Уладзіміра Высоцкага. А Зямля, гэты «круглы шар», нібы пячатка, «стаіць» у «пасведчанні» Аркадзя Куляшова, адзначаючы дакладнасць напісанага ў гэтым «дакуменце».

Прасачыўшы лёс Аркадзя Аляксандравіча, можна з упэўненасцю сказаць, што пражыў ён сваё жыццё недарэмна, як і ўсё яго пакаленне, якое так многа зрабіла для свайго народа і нашчадкаў.

У гэтым вершы Аркадзь Куляшоў паказаў тыя выпрабаванні, з якімі сутыкнуліся яго равеснікі. Пятрусь Броўка трапна заўважыў: «На кожны дзень — свае клапоты, ды і не можна без клапот». Так і на кожнае пакаленне — свае радасці і свае пакуты. Ідэя верша «Маё пасведчанне» — даць прыклад, як праходзіць праз жыццёвыя іспыты: сурова, смела, мужна, «з баявой выкладкай салдата».

Напрыканцы адзначым, што нашы дзяды і бацькі вытрымалі свае выпрабаванні (халодная вайна, развал СССР) і зразумелі думку, якую хацеў данесці Аркадзь Аляксандравіч.

Застаецца пытанне: а ці здолеем мы, пакаленне дваццаць першага стагоддзя, не ўпасці ад сваіх іспытаў? Прыслухоўваючыся да Куляшова, Коласа, Багдановіча і іншых выбітных сыноў Беларусі, знаходзячы ў іх творах падтрымку і натхненне, не ўпадзём і на спінах узнясём народ і Радзіму на сусветны п'едэстал. За намі будучыня і перамога!

Марк МАРЦУЛЕВІЧ,
выпускнік Гімназіі № 13 г. Мінска

«Мой выбар — пераадоленне»

Наталля Прыступа. Гэтае імя ў канцы дзевяностых — пачатку двухтысячных было вядома ў шырокіх паэтычных колах не толькі Беларусі, але і Расіі. Яе вершы друкаваліся ў калектыўных зборніках «Надзея», «Памяць аб крылах», «Лёгкіх карункаў чароўная чарада», у альманахах «Дзень паэзіі», «Гоман», «Берасцейскія карані», «Піншчына літаратурная», «Берагі Таўрыды», «Сустрэча» (Барнаул), у часопісах «Нёман», «Першацвет», «Акно», «Белыя снегіры» (Масква).

Наталля Прыступа.

А потым у далёкім 1996 годзе выйшаў першы зборнік вершаў Наталлі з сімвалічнай назвай «Спроба». Спроба заявіць аб сабе смела, упэўнена, ва ўвесь голас аказалася вельмі ўдалай. Яе паэзія прымалася чытачамі, знаходзіла водгук у іх сэрцах, і здзіўляючы, і захапляючы. У Н. Прыступы свой стыль, індывідуальны, не падобны на іншыя. Даследуючы паэзію Наталлі, вядомы літаратурны крытык, зямлячка Валянціна Локун адзначала, што яе творчасць «балансуе на мяжы рэалізму і мадэрнізму, лірыкі і інтэлектуалізму. Яе вершы метафарычныя і асацыятыўныя».

З прафесійнай ацэнкай наўрад ці трэба спрачацца. Лепш проста ўзяць зборнікі вершаў і чытаць-чытаць-чытаць, а многія рэчы нават перачытваць па некалькі разоў. Каб паглыбіцца ў сутнасць напісаных сэрцам радкоў, яе вачыма паглядзець на тое, што адбываецца вакол, перажыць яе боль, яе радасць, адчуць яе каханне, шчасце і яе ж успрыманне здрады, падману і іншага негатыву.

Встречать любовь по-новому хочу.
Откосы то крутые, то пологие…
Убеждена, что тоже научусь
водить успех тернистыми дорогами.

Удачи не слагаются нечаянно.
Проникнусь уважением к ошибке.
Ночь напролёт в блокнот
текло отчаянье.
Я знаю, всё закончится улыбкой.

Я памятаю яе ўсмешку, калі мы сустрэліся ўпершыню. За вокнамі рэдакцыі гарадской газеты «Пінскі веснік» шумела лета. Было сонечна і цёпла. Нехта з супрацоўнікаў, зазірнуўшы ў мой кабінет, сказаў, што на вуліцы мяне чакаюць. Выйшаўшы, сустрэлася з адкрытым ветлівым позіркам вялікіх блакітных вачэй, прамяніста ўсмешлівых. «Наталля Прыступа», — прадставілася дзяўчына. Я прапанавала перайсці ў цянёк высокага дрэва, якое расце каля нашага будынка, і прысела на лаўку. Наташыну інвалідную каляску ўладкавалі побач. І пацякла гутарка. Дзяўчына расказала пра сябе. Родам з вёскі Малоткавічы, што недалёка ад Пінска. Бацькі — служачыя. Скончыла Рэчыцкую спецшколу-інтэрнат для інвалідаў. На момант сустрэчы знаходзілася ў Пінску ў Доме міласэрнасці.

Каб не бянтэжыць суразмоўніцу, крадком разглядала яе. Пышныя светла-каштанавыя валасы ўкладзены ў прыгожую прычоску. Вочы і вусны акуратна падфарбаваныя. Дагледжанымі былі і яе маленькія пальчыкі з пазногцямі, афарбаванымі ў светла-ружовы. Такога ж колеру была і яе лёгкая блузка. Відаць, ад Наташы не схаваліся мае асцярожныя позіркі, але яна не сумелася, а проста заўважыла: «Выходзіць на людзі заўсёды трэба дагледжанай!» І прытрымлівалася гэтага прынцыпу да канца сваіх дзён.

Да завяршэння нашай гутаркі мы перайшлі на «ты», здавалася, што знаёмыя вельмі даўно. Сяброўства наша доўжылася да яе апошняга ўздыху.

Пасля першага паэтычнага зборніка ў 1997 годзе выходзіць другі — «Кляновае лісце», у 1998-м — «Быль», у 1999-м — «З любоўю», праз год — «Белы ўзмах» (у сааўтарстве з А. Мірчук), у 2004-м — «Два крылы». І нарэшце ў 2006 годзе — «У абдымках лёсу» (у сааўтарстве з В. Казакевічам). Амаль усе гэтыя зборнікі рэдагавала я, таму і змагла назіраць, як сталее, набірае сілы, імкнецца ўверх яе паэзія, каб у выніку заслужана называцца высокай. Мяне заўсёды захаплялі яе творчыя знаходкі, вывастраныя радкі, шырыня тэм, якія закраналіся ў вершах, незабыўныя выявы і сюжэты. Толькі талент вышэйшай пробы дазволіў Наталлі сказаць аднойчы:

Болею жизнью.
Гибну. Каюсь.
И каждый день в неё
влюбляюсь!

Валодаючы выдатным паэтычным дарам, Наталля Прыступа не адмаўляла ў дапамозе пачаткоўцам. Яна з задавальненнем адгукнулася на маю просьбу быць літкансультантам «Пінскага весніка» і працавала з аўтарамі цярпліва і добразычліва. Маючы добрае сэрца, будучы вельмі даверлівай, дазваляла быць з ёй побач не заўсёды прыстойным людзям, якія выкарыстоўвалі яе талент у сваіх мэтах. Яна адчувала гэта, разумела і тым не менш прымала. Можа, таму неяк і напісала:

В выборе судьбы была вольна.
Жить учила белая луна.
Как душе моей среди людей,
В чёрном небе одиноко ей.

У 2005 годзе Наталлю Прыступу прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Яна вельмі радавалася гэтаму. І працягвала ствараць, рыхтавала да выпуску чарговую, як аказалася, апошнюю кнігу. Давала мне на вычытку свае вершы. Я працавала над імі з нейкім пакуль што незразумелым пачуццём трывогі. У раздзеле «У кучаравых снегападах» Наталля разам з іншымі размясціла і вершы-прысвячэнні блізкім ёй людзям: маці, бацьку, брату, яго жонцы, пляменніку, а таксама землякам і сябрам, прычым з фатаграфіямі тых, каму былі адрасаваны яе лірычныя радкі. Нібы прадчувала бяду і развітвалася загадзя з усімі, хто ёй быў дарагі.

Я спрабавала разгаварыць яе, даведацца, што так трывожыць сэрца, хоць і ведала напэўна, аб чым яно баліць. Яна спазнала вялікае пачуццё, названае Каханнем. І такую ж па велічыні здраду.

Уходишь в дождь.
Не держишь слово снова.
И я прощать всё менее готова.
Стучится в окна дождь…
Тебе не больно?
Что делать нам
с живой ещё любовью?

Яно, гэтае жывое каханне, было ў яе сэрцы да апошняга. Неасцярожныя дзеянні ў адносінах да яе нечакана для ўсіх абарвалі яе жыццё ў самым росквіце — у 47 гадоў. Апошняя кніга «У абдымках лёсу» выйшла ў 2006 годзе пасля ўжо смерці Наталлі. І таксама была запатрабавана чытачамі, як і ўсе папярэднія.

Гэтыя паэтычныя радкі — з Наташынага апошняга зборніка:

Прельстится одиночество
видением утроенным.
Как сердцу без поэзии?
Классичен ритм и нов.
Роскошно, неожиданно
на трельяже устроилось
малиновое облако
неузнанных цветов.

Калаж Святланы Таргонскай.

Прыгожа, светла, нечакана, абнадзейліва.

Памяць не дазваляе забыць кранальныя і даверлівыя хвіліны нашых зносін з ёй. У сярэдзіне сёлетняй вясны ўсе яе сябры і прыхільнікі таленту віншавалі б Наталлю Прыступу з 65-годдзем. Не дажыла. Не дачакалася. Пайшла ад нас занадта рана.

Марыя ЛЯШУК
Фота даслана аўтарам

Выхаваць патрыёта

Да 90-годдзя з дня ўтварэння Саюза пісьменнікаў Беларусі па прапанове старшыні Мінскага гарадскога аддзялення СПБ Міхася Пазнякова студэнты Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта стварылі аб'яднанне «Літаратурная гасцёўня» (пры факультэце камерцыі і турыстычнай індустрыі). Спачатку па ўсіх факультэтах універсітэта было праведзена апытанне, каб выявіць жадаючых удзельнічаць у рабоце суполкі. Такіх аказалася больш за 70 чалавек. Затым рабочая група пачала распрацоўку Палажэння аб студэнцкай «Літаратурнай гасцёўні».

Былі пастаўлены наступныя задачы: патрыятычнае выхаванне студэнтаў на творах і лёсах пісьменнікаў; фарміраванне навыкаў публічных выступленняў; інтэлектуальнае, культурнае, мастацкае і духоўнае развіццё і г. д.

Напрамкамі дзейнасці «Літаратурнай гасцёўні» з'яўляюцца арганізацыя і правядзенне пасяджэнняў і сустрэч з пісьменнікамі, мерапрыемстваў, якія выхоўваюць пачуццё патрыятызму і прывіваюць любоў да роднага слова, супрацоўніцтва з аналагічнымі аб'яднаннямі ў структуры іншых навучальных устаноў.

Студэнты таксама плануюць праводзіць круглыя сталы з удзелам пісьменнікаў.

Арганізацыі літаратурнага аб'яднання паспрыялі дэкан факультэта камерцыі і турыстычнай індустрыі Н. Ерчак, намеснік дэкана Т. Базыльчук, загадчык кафедры фізікахіміі матэрыялаў і вытворчых тэхналогій А. Брайкова, а таксама студэнты названага факультэта: К. Броўка, Д. Нарэйка, З. Суша, С. Рагожына, А. Былінская, М. Зуброў, Т. Спургяш, А. Качаноўская, А. Васюкова, С. Калашнікава. З іншых факультэтаў найбольшую актыўнасць праявілі студэнты другога курса факультэта лічбавай эканомікі. Многія з іх парадавалі ўжо чытачоў газеты БДЭУ «Эканаміст» сваімі цікавымі апавяданнямі пра подзвігі сваякоў падчас Вялікай Айчыннай вайны.

З сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў эканамічнага профілю ў рабоце «Літаратурнай гасцёўні» прынялі ўдзел навучэнцы Каледжа бізнесу і права, якія перамаглі ў першым этапе рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове. Кіраўніком студэнцкага літаратурнага аб'яднання абраны прафесар, доктар біялагічных навук Канстанцін Саевіч.

Па заданні першага намесніка старшыні СПБ Алены Стэльмах будучыя супрацоўнікі турыстычнай індустрыі распрацоўваюць маршруты, звязаныя з жыццём, творчасцю і дзейнасцю беларускіх пісьменнікаў. Кансультантамі рэспубліканскага праекта, прысвечанага 90-годдзю Саюза пісьменнікаў Беларусі, сталі ганаровы старшыня СПБ Мікалай Чаргінец, старшыня СПБ Алесь Карлюкевіч, а таксама Алена Стэльмах і Міхась Пазнякоў.

Студэнты прынялі ўдзел у Міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы і ў іншых мерапрыемствах, якія праводзяцца Саюзам пісьменнікаў Беларусі. Таксама быў праведзены семінар, дзе студэнты расказалі пра сваіх сваякоў, якія ваявалі з фашыстамі падчас Вялікай Айчыннай вайны.

Уладзімір САЕВІЧ,
член «Літаратурнай гасцёўні», навучэнец 2-га курса эканамічнага аддзялення Каледжа бізнесу і права

З летапісу Вялікай Айчыннай

Адлюстраванне вайны і яе герояў, франтавых і партызанскіх будняў сталі асноўнай тэмай творчасці мноства савецкіх мастакоў. Паказаць праўду і выказаць свой погляд на страшныя падзеі і пасляваенны час — такія арыенціры творчасці выбралі для сябе і цэлыя пакаленні беларускіх мастакоў. Убачанае і перажытае імі самімі ды іх блізкімі ў тыя гады назаўжды стала часткай мастацкіх пошукаў. Гаворка пра айчынных майстроў не толькі савецкага перыяду, але і сучаснікаў — у кожнага ёсць тое, што немагчыма выкінуць з памяці. Хоць, вядома, многія мастакі, пісьменнікі, музыканты, якія перажылі вайну, доўга не адважваліся брацца за тэму…

Да 1 верасня ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага і выставачных залах Музея гісторыі горада Мінска на Ракаўскай, 17 працуе выстаўка «Памяць пакаленняў». Кожны яе твор у той ці іншай ступені прысвечаны мужнасці, гераізму папярэднікаў, у кожным гучыць удзячнасць тым, хто змагаўся і абараняў краіну, яе народ. Гэта тая самая памяць пакаленняў, што не адпускае, не дазваляе забыць аб подзвігу продкаў.

Мастацтва, прысвечанае тэме Вялікай Айчыннай вайны, застаецца запатрабаваным — аўтары, адлюстроўваючы розныя яе аспекты, маглі і могуць глыбока адчуць боль і пакуты народа, а яшчэ — радасць перамог. Ды колькі праз гэта можна сказаць — пра жыццё і смерць, бацькоўства, мацярынства і дзяцінства, барацьбу, боль, гора і страты, нават пра прыроду, якая красамоўна перадае стан чалавека і чалавецтва.

Усе творы выстаўкі «Памяць пакаленняў» — з фондаў Беларускага саюза мастакоў; гэта класіка беларускага жывапісу, хоць сярод аўтараў ёсць і сучаснікі, напрыклад, Уладзімір Уродніч і Мікалай Ісаёнак. Для першага надзвычай важная мемарыялізацыя памяці аб вайне. У яго творах часта можна сустрэць рэлігійныя матывы, героі сталага ўзросту, якія прайшлі праз пекла вайны, часта выяўлены на палотнах побач з загінулымі ў той час маладымі людзьмі. Гэтай непарыўнай сувязі прысвечана і карціна «Кветкі памяці» (1990). Мікалай Ісаёнак, які, дарэчы, у адрозненне ад Уладзіміра Уродніча, нарадзіўся ўжо пасля вайны, не заглыбляецца ў сімвалізм, а проста расказвае агульную гісторыю мільёнаў людзей, якія трапілі ў складнае становішча. Палатно «У чаканні вестак» (1985), лаканічнае па колеравым і кампазіцыйным рашэнні, адно з найбольш камерных у экспазіцыі.

Натан Воранаў «Зямля непакораная», 1974 г.

Заір Азгур «Слава загінулым героям» (гарэльеф для манумента Перамогі), 1954 г.

Мікалай Залозны «Вярнуўся», 1975 г.

Так, праект аб'яднаў даволі маштабныя, манументальныя карціны — і гэта робіць моцнае ўражанне. Дзякуючы падбору твораў і канцэпцыі «Памяць пакаленняў» можна назваць адной з самых удалых тэматычных выставак апошняга часу. Яркія (калі гаварыць пра мастацкае і эмацыянальнае ўспрыманне) творы выяўленчага мастацтва і сёння звяртаюцца да патрыятычных пачуццяў гледача. Арганізатары вылучылі некалькі тэматычных раздзелаў, асноўнае — будні супрацьстаяння з фашызмам, трыумф Перамогі, усталяванне спакойнага мірнага жыцця і памяць аб загінулых, аб страшных гадах.

Між іншым, цэнтральнае месца цалкам жывапіснай экспазіцыі займае гіпсавая мадэль гарэльефа «Слава загінулым героям» з фондаў Мемарыяльнага музея-майстэрні Заіра Азгура, створаная Заірам Ісаакавічам для манумента Перамогі ў Мінску. Помнік, які ўваходзіць у ансамбль Круглай плошчы, — сапраўдны сімвал сталіцы, адзін з яе апазнавальных знакаў. Чатыры бакі абеліска ўпрыгожаны бронзавымі гарэльефамі. Апроч Заіра Азгура ўдзел у іх стварэнні прынялі скульптары Андрэй Бембель («9 мая 1945 года»), Сяргей Селіханаў («Савецкая армія ў гады Вялікай Айчыннай вайны») і Аляксей Глебаў («Партызаны Беларусі»).

Трагедыю вайны, крова-пралітныя баі і барацьбу партызан паказалі ў сваіх творах Натан Воранаў («Зямля непакораная», 1974), Уладзімір Пасюкевіч («Старыцкія партызаны», 1985), Іван Ціханаў («Кастрычнік 1941 г.», 1977—1978), Сяргей Раманаў («У адзіным страі», год стварэння не пазначаны) ды іншыя. Найбольш шчымлівыя работы — тыя, што адлюстроўваюць асабістую трагедыю, напрыклад, «Мужнасць» (1969) Аляксандра Казлоўскага: фашыст пад дулам аўтамата вядзе па снезе басаногага юнака ў белай кашулі; ці «Хлеб партызанам» (1984) Мікалая Федарэнкі: на зімовым палатне — група людзей, сур'ёзных, суровых, разгубленых…

Значную ўвагу арганізатары надалі тэме Вялікай Перамогі — гледачы маюць магчымасць убачыць надзвычай яркія палотны «Дома» (1968), «Вярнуўся» (1975) Мікалая Залознага, «Салдаты і кветкі» (1985) Мікалая Назарчука, «Май 1945 г.» (1968) Івана Стасевіча… Аднак ключавыя творы выстаўкі ўсё ж прысвечаны тэме смутку і памяці. Між іншым, у гэтым рэчышчы заўважны яшчэ адзін вектар тэматычнага жывапісу — пакутлівыя ўспаміны аб вайне. Калі былых франтавікоў трывожаць старыя раны, калі яны не знаходзяць сваё месца ў мірным жыцці — вядома, многія адчуваюць сябе паўнацэннымі людзьмі толькі побач з такімі ж былымі салдатамі. Пра гэта гаворка на выстаўцы ідзе не адкрыта, а мімаходзь. Падобнае прысвячэнне — ужо згаданая работа Уладзіміра Уродніча, на гэтую ж тэму разважаюць Уладзімір Кожух у творы «Дзень Перамогі» (1983), Галіна Туроўская ў карціне «Памяць. Партрэт ветэрана Нізаўцова А. Л.» (1985) і Георгій Качаноўскі ў творы «Памянём» (1994). Глыбінёй думак і высокім ідэйным зместам вылучаецца работа «Імша паўшым» (1990) Ігара Бархаткова — змрочны напамін аб былой трагедыі. Былой для многіх толькі дэ-юрэ.

Фёдар Бараноўскі «Вызваленне Мінска», 1984 г.

Мікалай Ісаёнак «У чаканні вестак», 1985 г.



Барыс Няпомняшчы «Маці», 1981 г.

P. S. Гэтым разам мы разважалі пра экспазіцыю ў галерэі Савіцкага. Між тым у другой частцы выстаўкі ў музеі гісторыі Мінска прадстаўлены графічныя работы Васіля Шаранговіча, Рыгора Віткоўскага, Уладзіміра Басалыгі, Анатоля Тычыны, Івана Пратасені і Сяргея Раманава, прысвечаныя партызанскаму і падпольнаму руху, пасляваеннаму адраджэнню і захаванню памяці аб Вялікай Айчыннай вайне. Тут таксама дэманструюцца рэдкія экспанаты — прадметы з тэрыторыі Мінскага гета з калекцыі музея Мінскага дзяржаўнага каледжа будаўніцтва імя У. Г. Каменскага. Прадметы быту, знойдзеныя падчас археалагічных даследаванняў тэрыторыі лагераў смерці «Благаўшчына» і «Трасцянец», перададзеныя Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук. Дапаўняе экспазіцыю стэнд аб аперацыі «Баграціён» з Дзяржаўнага музея гісторыі Узброеных Сіл — можна пазнаёміцца з планамі, схемамі, фотаздымкамі, дакументамі, што суправаджаюцца каментарыямі аб гэтай маштабнай аперацыі ў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Яўгенія ШЫЦЬКА, фота аўтара

Ілюстратар Пушкіна і Грачанікава

Імёны яркіх творчых асоб не заўсёды застаюцца ў памяці нашчадкаў. Праўда, калі імі зроблена даволі шмат, зроблена таленавіта, да іх спадчыны ўсё ж пэўны час будзе прыкавана ўвага даследчыкаў.



Вячаслаў Тарасаў.

Якраз яны, гісторыкі мастацтва, руплівыя збіральнікі памятак беларускай культуры, і не забываюцца на зробленае ў айчыннай культуры мастаком, сцэнографам, мастаком-мультыплікатарам Вячаславам Тарасавым (1938—1997). Пра яго на старонках «Літаратуры і мастацтва» пісала дасведчаны кіназнаўца Антаніна Карпілава: «У ранні перыяд адной з балючых праблем анімацыі была адсутнасць кантактаў з мастакамі-графікамі: вядома, што сярод першакрыніц мультыплікацыі кніжная графіка займае адно з галоўных месцаў. Прыход у анімацыю і плённая дзейнасць Вячаслава Тарасава спрыялі наладжванню такіх сувязяў. Тарасаў дадаў беларускай анімацыі высокую культуру кніжнай графікі, лірызм і мяккі гумар. Почырк мастака характарызуе пошук тыповага і індывідуальнага ў візуальным выглядзе герояў і асяроддзя, дакладны адбор пластыкі і характэрнай мімікі персанажа. Ён працаваў з рознымі рэжысёрамі: Львом Шукалюковым, Уладзімірам Пузанавым, Юрыем Бутырыным, Ігарам Воўчакам, Аленай Туравай, але часцей за ўсё — з Белавусавым, які зняў з мастаком амаль усе свае стужкі».

Пра Вячаслава Аляксеевіча — і ў манаграфіі Міхаіла Баразны «Беларуская кніжная графіка 1960—1990-х»: «Новыя пластычныя рысы былі прыўнесены ў беларускую кніжную графіку 1980 — 1-й палавіны 1990-х гадоў выпускнікамі мастацка-прамысловага факультэта БДТМІ (цяпер факультэт дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДАМ). Тут можна назваць такія прозвішчы, як М. Байрачны, С. Войчанка, Э. Жакевіч, А. Кітаева, У. Лукашык, С. Пчалінцаў, М. Сенькін, А. Шалюта, У. Цэслер, У. Цярэнцьеў, Ю. Тарэеў і інш. Да групы гэтых мастакоў, якія не вучыліся на станковых аддзяленнях, можна далучыць і мастакоў кнігі, якія атрымалі мастацка-прамысловыя спецыяльнасці за межамі рэспублікі (В. Тарасаў)». У манаграфіі Міхаіла Рыгоравіча ў «Біяграфічным слоўніку» змешчаны і тры радкі біяграфіі Вячаслава Аляксеевіча Тарасава…

Нарадзіўся мастак у Расіі, у Растове Яраслаўскай вобласці. Невялікі горад з насельніцтвам каля 30 тысяч чалавек. 186 кіламетраў ад Масквы, 47 — на паўднёвы захад ад Яраслаўля. Згадкі ў летапісах — з 862 года. Упершыню — у «Повести временных лет». Растоўскі крэмль і цяпер упрыгожвае гэты расійскі раённы цэнтр. У горадзе нават тэатр ёсць (заснаваны ў 1920 годзе). Вядомасць мае музей фініфці. Дарэчы, у яраслаўскім Растове, які часта называюць Растоў Вялікі, нарадзіліся народны мастак Расійскай Федэрацыі Аляксандр Аляксееў, член-карэспандэнт Акадэміі мастацтваў СССР кніжны графік Генадзь Епіфанаў, акадэмік Расійскай акадэміі мастацтваў імпрэсіяніст Андрэй Захараў, мастацтвазнаўца Ірына Лебедзева, якая ў 2009—2015 гадах займала пасаду дырэктара Дзяржаўнай Трацякоўскай галерэі, рускі жывапісец, графік Мікалай Ломцеў… З горадам звязаны імёны і іншых дзеячаў выяўленчага мастацтва. Зоркавая канцэнтрацыя яркіх асоб на такую невялікую растоўскую прастору!.. І зразумела, што, маючы цікавасць да творчасці, маладому чалавеку нельга было не выбраць шлях у мастацтва…

Вячаслаў Тарасаў у 1962 годзе скончыў факультэт прыкладнога мастацтва Маскоўскага тэкстыльнага інстытута. Спецыяльнасць — «Мастацкае афармленне тканін і вырабаў». У наступныя гады лёс звязаў мастака з Рэспубліканскім домам мадэляў у Мінску, дзе ён працаваў да 1970 года. Але прага выказацца была мацнейшай, чым вырашэнне задач па асноўным месцы працы. І ў 1971 годзе Тарасаў становіцца мастаком-пастаноўшчыкам у Беларускім тэатры юнага гледача. З першых работ на новым месцы — афармленне спектакляў «Пэпі Доўгаяпанчоха» і «Новыя прыгоды Карлсана» паводле Астрыд Ліндгрэн, «Зялёная птушка» Карла Гоцы. А яшчэ ён аформіў «Палёт» па п'есе Уладзіміра Мехава, «Адчыніце, казляняткі!» паводле Петруся Макаля і іншыя спектаклі. У 1973 годзе Вячаслава Тарасава прынялі ў Саюз мастакоў БССР.

З 1976 года таленавіты творца — мастак-пастаноўшчык студыі мультыплікацыйных фільмаў кінастудыі «Беларусьфільм». Адна з яркіх работ Вячаслава Тарасава у мультыплікацыі — «Песня пра зубра». Мультфільм быў створаны рэжысёрам-пастаноўшчыкам Алегам Белавусавым. Ён і сцэнарый напісаў. Аператар-пастаноўшчык — Міхаіл Комаў.

Кадр з мультфільма «Светлячок і Расінка».

Кампазітар — Леанід Захлеўны. Мультыплікацыйную экранізацыю, зробленую да юбілею напісання славутай паэмы (1522 год; першая публікацыя ў 1523-м), заўважылі. Гэты яркі фільм працягласцю 17 хвілін 51 секунда — не адзіная супольная праца Вячаслава Тарасава і Алега Белавусава. Былі яшчэ і «Казка пра вясёлага клоўна», «Ладдзя роспачы» (па аповесці Уладзіміра Караткевіча), «Куб» (прысвечаны памяці мастака Юніса Сандгазіна; анімацыя заснавана на яго малюнках алоўкам), «Вельмі стары чалавек з велізарнымі крыламі» (па матывах апавядання Габрыэля Гарсія Маркеса)… Пра працу над фільмам «Вельмі стары чалавек…», згадваючы Вячаслава Тарасава, Алег Белавусаў напіша: «Слава адчуваў кожны кадр фільма нейкім зусім фантастычным чуццём. Мы рабілі карціну "Вельмі стары чалавек з велізарнымі крыламі" па раннім апавяданні Габрыэля Гарсія Маркеса. Я прыдумаў, што герой апавядання, стары, абадраны Анёл, які ў Маркеса трапляе ў калумбійскую вёску, прызямляецца на беларускі хутар, дзе ў мяне было лецішча, пад Маладзечна, у Цямніцу… Па ходу фільма ішлі дажджы, было мокра, туманна… У мультыплікацыі гэтае самае "мокра" і "туманна" трэба намаляваць, зрабіць фоны… Як Слава іх рабіў — трэба было бачыць… Велізарным, амаль малярным пэндзлем, па двухметровым рулоне паперы — мазне раз, мазне два — гатова… Калі б не давяраў яго густу і майстэрству — выў бы і сварыўся, так гэты фон выглядаў… Аднак знялі… Атрымалася — лепей не бывае… Калі паказвалі гэты фільм калегам у Браціславе, падыходзілі, цмокалі языкамі, захапляліся, — як дакладна, як бездакорна, з якім густам перададзены дробны дождж, які імжыць, якое адчуванне вільготнасці, волкасці».

І за ўсімі гэтымі пошукамі, знаходкамі, адкрыццямі таленавітага мастака тэатра і мультыплікацыі было яго захапленне кніжнай графікай. Вячаслаў Тарасаў аформіў дзясяткі кніг самых розных аўтараў. Гэта і аповесці Васіля Быкава «Жураўліны крык. Трэцяя ракета. Альпійская балада» (выданне «Мастацкай літаратуры» 1972 года), і кнігі Льва Мікалаевіча Талстога,

СЛУГА І ЎЛАДАР

У возера,
Што гадамі кішэла,
З дрыгвяністым
І берагам і дном
Упаў лябёдка —
Ком крывава-белы,
Падбіты ўласнаручна
Ўладаром.

У сёдлы
Зашываліся вяльможы
Ад страху,
Як вужакі у нару,
Пачуўшы голас грозны:
— Хто з вас можа
Падаць здабычу
Ў рукі ўладару?

41

Ілюстрацыі да кнігі Анатоля Грачанікава «Зорны палёт».

Аляксея Талстога, Мікалая Ввасільевіча Гогаля, Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага, Уладзіміра Караткевіча, Леаніда Дайнэкі, Эдуарда Скобелева… Шмат супрацоўнічаў Вячаслаў Аляксеевіч з выдавецтвам «Юнацтва», якое было заснавана ў Мінску ў 1981 годзе. Менавіта для «Юнацтва» Тарасаў аформіў кнігі Льва Касіля, Чынгіза Айтматава, Уладзіміра Машкова, іншых пісьменнікаў розных пакаленняў. У афармленні Вячаслава Тарасава ў «Юнацтве» пабачыла свет і паэма Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна «Руслан і Людміла»…

Гартаю старонкі кнігі лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР і прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Анатоля Сямёнавіча Грачанікава «Зорны палёт», якая пабачыла свет у «Юнацтве» ў 1988 годзе. Разам сабраны вершы ў радзеле «Зорны палёт» і асобна вылучаны раздзел «Вершы. Казкі і легенды». Тыраж кнігі, якая выдадзена на высокім паліграфічным узроўні, — 40 000 экзэмпляраў. Зборнік твораў адрасаваны дзецям дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Аддрукаваны ёмісты том на Мінскай фабрыцы каляровага друку. А дыяпазітывы тэксту падрыхтаваны на Мінскім паліграфкамбінаце імя Якуба Коласа. Гэта цяпер яны зліліся ў адно прадпрыемства. А тады, у 1980-я, — два розныя паліграфічныя гіганты беларускай сталіцы. Можна сказаць, аснова беларускай кніжнай індустрыі… Вячаслаў Тарасаў выканаў для кнігі, багатай на літаратурныя вобразы і дынамічныя сюжэты, каля 40 ілюстрацый. Суладна з паэтычным словам Анатоля Грачанікава, якога варта назваць у беларускай дзіцячай літаратуры майстрам ствараць сюжэты, мастак арганізаваў тэатральны характар кнігі. Праца графіка дапоўніла фантазію пісьменніка — і часам складваецца ўражанне, што многія творы (асабліва гэта датычыцца казак і легенд) павінны, абавязаны стаць мультфільмамі ці спектаклямі. Пластычная мова творцы настолькі прыцягальная, што часам пры чытанні вымушана спыняешся і ўглядаешся ў вобразы герояў Анатоля Грачанікава — шасцігадовай дзяўчынкі Алесі, якая шукае крыніцу з гаючай вадою («Жывая вада»), каваля Мірона і прыгажуні Яніны («Чорны замак»), ганчара Івана («Казка пра Івана-ганчара і пачвару-цара»)…

Працаваў Вячаслаў Тарасаў і ў станковым жывапісе. З 1966 года ўдзельнічаў у мастацкіх выстаўках. Работы Вячаслава Аляксеевіча знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, у фондах Беларускага саюза мастакоў. Добра было б юбілей мастака (у 2028-м 90-годдзе з дня нараджэння) адзначыць выстаўкай. Напрыклад, у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры альбо ў іншым літаратурным музеі краіны. І тым самым нагадаць пра здзейсненае творцам для беларускай кнігі…

Раман СЭРВАЧ



«Дзяцінства», 1972 г

Адлюстраванне жыццялюбства

Чалавек — істота складаная, але, нягледзячы на асаблівасці характару, якія могуць быць уласцівы асобнаму індывіду, яму ўсё адно ў жыцці патрэбны іншыя людзі. Можа быць, у пэўных абставінах ці выпадках. Можа быць, у нейкай надзвычайнай сітуацыі. А можа быць, калі вельмі стаміўся быць адзін. Ну, здараецца ж такое нават з тым, хто па натуры самотнік — ён ідзе да людзей. Калі не наўпрост шукае кантактаў, то неяк так, каб гэта выглядала вельмі абгрунтавана.

Вось і Ён — герой спектакля «Рок-н-рол на захадзе» — немалады чалавек, але пайшоў вучыцца танцаваць. Прычым, рок-н-рол! Танец, для якога патрэбны малады спрыт ды кураж. А тут герой сталага веку. Праўда, ненадоўга хапіла яго імпэту, таму што зразумеў: не дадзена. І перастаў хадзіць на заняткі. Толькі ўлічыў, што ў пары з ім была Яна, якая цяпер засталася без партнёра. А трэба добра пашукаць, з кім у пару можна паставіць немаладую жанчыну. Але Яна — чалавек зусім іншы па характары: так проста пасаваць перад абставінамі не будзе. Калі партнёр знік, то яго трэба знайсці і вярнуць... І аднойчы ў яго дзвярах з'яўляецца дзіўнаватая, але вельмі настойлівая жанчына. З гэтага пачынаюцца іх урокі танцаў — па кнізе. Бо ў групе цяжка асвойваць рок-н-рол тым, хто ўжо немалады і не такі спрытны, як іншыя. Да таго ж цалкам пазбаўлены слыху і пачуцця рытму. Але калі ў сваім рэжыме, карыстаючыся дапаможнікам... То можна дасягнуць фенаменальнага поспеху, і не толькі ў танцы, а наогул у жыцці. Таму што яно пакрысе пачынае мяняцца.

Спектакль паводле п'есы Міхаіла Хейфеца выпусціла рэжысёр Таццяна Аксёнкіна. Выбар матэрыялу для пастаноўкі, магчыма, некаму падасца дзіўным: тэатр маладзёжны, а героі — людзі сталага веку. Але, калі ідуць у групу танцаваць рок-н-рол, то яны дакладна маладыя душой. І сама п'еса з разраду тых, пра якія кажуць «глядацкая». То-бок даволі іранічная, лёгкая для успрымання гісторыя, у якой усё трымаецца на двух выканаўцах — такія п'есы падыходзяць для антрэпрыз, калі трэба зрабіць акцэнт на выканаўцах, бо насамрэч тут галоўнае — ігра артыстаў. Пара, якую давялося бачыць на сцэне, — заслужаная артыстка Беларусі Наталля Анішчанка і Юрый Шэланкоў. Але выйдуць у гэтых ролях і іншыя выканаўцы — і будзе яшчэ адзін варыянт спектакля (напрыклад, у Ганны Лавухінай атрымалася свая Яна). Усё таму, што варыянтаў самоты (адпаведна, яе адчуванняў, нюансаў, адценняў) можа быць шмат. І шмат варыянтаў таго, як экзальтаваная жанчына можа пераканаць упартага мужчыну ў тым, што ім проста неабходна асвоіць гэты танец. Насамрэч таму, што абодва апынуліся адзінокімі, нягледзячы на тое, што могуць хваліцца адзін перад адным сваімі паспяховымі ўнукамі. Але кожны жыве адзін. І кожны з іх па-свойму прагне асабістага шчасця. І кожны намацвае шлях да яго — ці то падчас размоў, ці то падчас сварак і папрокаў, якія ўзнікаюць пры сустрэчах дзеля заняткаў, што адбываюцца ў яго дома.

На вялікай сцэне маладзёжнага тэатра мы бачым умоўную кватэру: проста, без прэтэнзій, але рацыянальна і даволі стрымана — гэта Яго жытло. Але сцэнаграфічнае рашэнне (мастак-пастаноўшчык Андрэй Меранкоў) адначасова дазваляе падкрэсліць тэму рок-н-ролу: лінія герояў час ад часу перабіваецца яскравымі танцамі дзяўчат і хлопцаў, якія выклікаюць моцныя эмоцыі і запальваюць публіку (харэаграфія Яўгена Лук'янава). Гэта даволі яркія эпізоды (і не толькі з-за адметнай вопраткі дзяўчат), у якіх заняты артысты тэатра. Танец узнікае абсалютна натуральна, гэтыя перабіўкі даволі эфектныя і ўражваюць гледачоў часам не менш, чым разборкі паміж героямі. За танцамі цікава назіраць, яны вельмі ажыўляюць дзею. Рашэнне ўвесці «танцавальныя паўзы» і іх выкананне дапамагло дадаць у спектакль лёгкасці. Наогул, у некаторых момантах эфектнае з'яўленне танцораў — у экранах, якія падсвечваюцца (мастак па святле Сяргей Азяран) — стварае пэўнае ўражанне і настрой. Той выпадак, калі танцавальныя ўстаўкі — не проста дадатковы элемент, яны працуюць сістэмна, бо праходзяць праз увесь спектакль. І дапамагаюць зразумець, чаму ж гэтыя двое, вырашыўшы асвойваць танцы, не ідуць у залу, а працягваюць займацца дома.

Цягам двух аддзяленняў глядач сочыць за развіццём іх адносін. І за пераменамі ў героях, якія адбываюцца дзякуючы іншаму чалавеку, які з'явіўся ў жыцці. Спачатку яны не разумеюць, што гэтая сустрэча невыпадковая. Жанчына, якая быццам бы фурыя ўрываецца ў яго жыццё з прэтэнзіямі, напачатку выглядае нібыта дзівачка, якой усё роўна, як яна выглядае. З кожнай новай сустрэчай нешта мяняецца ў яе знешнасці (але мы разумеем, што не толькі). Пакуль Ён і Яна асвойваюць па падручніку пару тактаў танца, мы даведваемся пра тое, як яны жывуць. Што на дзень нараджэння да яго ніхто з родных не прыйшоў павіншаваць, і толькі вось гэтая чужая жанчына становіцца адзінай, хто падзяліў яго свята. Гэтыя двое паступова раскрываюцца адзін для аднаго — і для гледача.

Ці не зразумела, да чаго ўсё ідзе? Ды гэта відавочна ці не з самага пачатку. Калі ёсць два чалавекі, якія пры сустрэчы сварацца, але аб'яднаны агульнай мэтай, то, так ці інакш, ім прыйдзецца паразумецца, адчуць цеплыню ў дачыненні да свайго партнёра па танцах. І выканаць свой рок-н-рол так, як гэта зрабілі б якія-небудзь зоркі танцпола. Але ці будуць разам два настолькі розныя чалавекі?..

Нягледзячы на тое, што галоўных герояў усяго два, артыстаў, якія працуюць у спектаклі, насамрэч многа: акрамя Наталлі Анішчанка, Ганны Лавухінай, Юрыя Шэланкова, тут яшчэ заняты Юрый Зінчанка, Юлія Сурмейка, Віялета Сарвірава, Кірыл Акуленец, Аляксандра Змітровіч, Лізавета Ільеўская, Мікалай Варабей, Аляксей Вінаградаў, Уладзімір Бажкоў.

Прэм'ера ў Маладзёжным тэатры якраз прыйшлася на лета, калі людзі шукаюць магчымасці разняволіцца і адпачыць, не надта напружваючы сябе разважаннямі, а гэтая чалавечая гісторыя без мудрагелістасці. Да таго ж, у Маладзёжнага тэатра ёсць публіка, якая ведае, што за эмоцыі тут атрымае, шукае адпаведныя пастаноўкі — і заўсёды цёпла прымае такія спектаклі. Нягледзячы на тое, што спектакль пра людзей ва ўзросце, публіка ў зале была рознай, магчыма, маладым людзям цікава зразумець, што ў іх немаладых сваякоў, бабуль ды дзядуль можа быць напоўненае асабістае жыццё.

Летам, калі тэатры адзін за адным пачынаюць сыходзіць у адпачынак, а людзям хочацца правесці вечар культурна, то ў іх з'явілася такая магчымасць — і не адна. Таму што яшчэ адна летняя прэм'ера ў Маладзёжным — пластычны спектакль «Шынель» паводле Гогаля на малой сцэне. Але гэта абсалютна іншая пастаноўка, якраз для тых, хто шукае чаго-небудзь «не такога».

Цікава, што на летнія паказы на вялікай сцэне людзі прыходзяць у маладзёжны тэатр як на свецкае мерапрыемства: вячэрнія доўгія сукенкі, урачыстыя строі — тым больш, што прэм'ера (у халодны час меней магчымасцяў сябе паказаць). Але ўсё ж перапынак будзе, наступныя сустрэчы з гледачамі Яна і Ён чакаюць ужо ў новым сезоне, а спектакль застанецца ў афішы.

Ларыса ЦІМОШЫК
Фота Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра

Некалькі імгненняў

Тэатры ды канцэртныя арганізацыі бадай што ўсе сышлі ў адпачынак, але адметныя сустрэчы адбываюцца нават у гэты час. Напрыклад, з асобнымі салістамі Вялікага тэатра. У прыватнасці, народную артыстку Беларусі Ніну Шарубіну і заслужаную артыстку краіны Таццяну Траццяк можна было пачуць днямі ў канцэртнай зале «Верхні горад» у межах праекта Таццяны Старчанка. Гэтым разам яна прапанавала праграму «Імгненні кахання», прысвечаную вядомаму савецкаму кампазітару Мікаэлу Тарывердзіеву.

Яго музыку шырокая аўдыторыя можа ведаць па кінафільмах. Тарывердзіеў з'яўляецца аўтарам мелодыі да шматсерыйнага фільма «Сямнаццаць імгненняў вясны» — і які без яе канцэрт? Таксама як без музыкі да «Іроніі лёсу...». Музыку да фільмаў «Вольга Сяргееўна» ды «Адам бярэцца з Евай» ды іншых таксама ўключылі ў праграму. Але насамрэч Мікаэл Тарывердзіеў стварыў вельмі шмат: пісаў сур'ёзныя сімфанічныя творы, аўтар балетаў і опер. Сярод іх, напрыклад, арыгінальная монаопера «Чаканне», якую таксама вырашылі прадставіць беларускім слухачам. Чым жа яна арыгінальная? Асновай для не надта працяглага твора стала паэма Роберта Раждзественскага, дзе гучыць маналог сучаснай жанчыны, якая прыйшла на спатканне з каханым. Нейкія паўгадзіны чакання — а ў гераіні за гэты час праходзіць віхор думак і эмоцый, якія перадаюць словы і музыка: тут і жарсць, і надзея, і адчай, бо ёсць боязь страціць каханне, і шчырасць, з якой чалавек разважае пра самае патаемнае... Унікальную магчымасць пачуць гэты твор падаравала Таццяна Траццяк.

Вось што адрознівае праграмы, якія прадстаўляе Таццяна Старчанка — яна ўмее спалучыць папулярнае і малавядомае, але кранальнае для слухача. У выпадку з музыкай Тарывердзіева гэта здавалася б, проста: бяры праверанае часам, тое, што стала «хітамі» — іх жа дастаткова для паўнавартаснага канцэрта. Але ж, не адмятаючы і гэтую задачу, — прыцягнуць у філарманічную залу публіку можна праз вядомыя імёны і творы. Бо людзей можна зачапіць і тым, што яны, магчыма, пачуюць упершыню, што выконваецца рэдка, як вось гэты музычны маналог «абцяжаранай» штодзённымі клопатамі жанчыны, якая ў гэтай мітусні працягвае спадзявацца на асабістае шчасце.

І музычныя «маналогі» іншага характару былі ўключаны ў канцэртную праграму, запланаваную на 18 ліпеня: камерныя творы і сола раяля. Таму што было б дзіўна не пачуць піяністку Таццяну Старчанка, якая прадумвала і рыхтавала гэты вечар.

Але калі на афішы імя вядомага кампазітара, то немагчыма без пазнавальных, шчымлівых інтанацый і мелодый, якія зрабілі яго сапраўднай зоркай. Ён ствараў вакальныя цыклы на вершы вядомых паэтаў — ад Шэкспіра да Маякоўскага ды сваіх сучаснікаў. Падчас канцэрта ў зале «Верхні горад» гучала паэзія Марыны Цвятаевай, якая таксама натхняла кампазітара. Рамансы ды песні, якія некалі прагучалі ў фільмах, палюбіліся мільёнам гледачоў, можна было пачуць у выкананні прымы опернага тэатра Ніны Шарубінай.

Гэта была апошняя сустрэчы сезона ў канцэртнай зале. Але аматары музыкі могуць сачыць за імпрэзамі, якія запланаваны на лета ў Верхнім горадзе.

Ларыса ЦІМОШЫК

Мікалай СЦЕШЫЦ:

«Займаюся тым, што падабаецца»

Вядучы майстар сцэны, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Мікалай Сцешыц сёлета адзначыў два юбілеі. Першы — 30 гадоў творчай дзейнасці ў Магілёўскім тэатры лялек, а другі — вясной артыст адсвяткаваў сваё 55-годдзе. Мы не маглі абысці такія значныя падзеі ў жыцці вядомага акцёра-лялечніка і сустрэліся з Мікалаем Арсеньевічам, каб пагаварыць пра жыццё, тэатр і прыгадаць, з чаго пачынаўся яго творчы шлях.

Шлях у прафесію

— Я заўсёды ведаў, што буду акцёрам. Вырашыў паступаць пасля дзявятага класа. Сказаў маці, што ўсё, далей вучыцца ў школе не буду — пайду ў тэатральнае вучылішча. (Лічу, лепш займацца тым, чым хочаш.) Паехаў у Днепрапятроўск, бо ў нас не было такіх вучылішч. Паступіў на акцёра тэатра лялек. Гэта цікавей, чым быць акцёрам драматычнага тэатра. Падчас гутаркі мне растлумачылі, што акцёр тэатра лялек набудзе нашмат больш у параўнанні з акцёрам «драмы». Напрыклад, у нас была ўзмоцненая пластычная адукацыя. Лічу, той багаж ведаў, які атрымаў, мяне вядзе і да гэтай пары.

Усе мае родныя жывуць у Любані. Уяўляеце, якая радасць была, калі паступіў у тэатральнае вучылішча! Мама горда хадзіла па нашым гарадку, хоць спачатку і не вельмі хацела бачыць мяне артыстам (*смяецца.* — **Заўв. аўт.**).

У вучылішчы была хутчэй не вучоба, а выхаванне чалавека як асобы, як акцёра. Памятаю, мы прыходзілі а восьмай раніцы, сыходзілі, бывала, а другой гадзіне ночы.

Ведаеце, усё закладваецца ў раннім узросце ў навучальнай установе. Здзіўляюся педагогам і рэжысёрам, якія ўмеюць вызначыць, каго з дзяцей узяць, а каго не. Памятаю сябе, калі паступаў: у шорціках, у цяльняшцы — зусім дзіця (*усміхаецца.* — **Заўв. аўт.**).

Курс набіраўся моцны. І калі ты быў прафнепрыдатны, то аб гэтым казалі і, у лепшым выпадку, пераводзілі ў «культпрасвет». У нас было на курсе ўсяго 12 чалавек, а дайшлі да канца толькі пяць. Адлічыць маглі за паводзіны. Мяркую, паводзіны — гэта важна. Не прыйшоў на экзамен, сарваў урок — гэта сто працэнтаў адлічэнне з вучылішча. Было вельмі строга.

Гады студэнцтва праляцелі незаўважна. Мае аднакурснікі працуюць па ўсім свеце. Шмат каго можна ўбачыць у расійскім кіно. У мяне ж няма цёплых пачуццяў да гэтага віду мастацтва.

Быць драматычным акцёрам мне нават лягчэй. Памятаю, калі вярнуўся з арміі, цяжка было знайсці працу. Удалося ўладкавацца ў Слонімскі драмтэатр. Потым быў Магілёўскі драматычны... І толькі наш абласны тэатр лялек стаў маім другім домам. Адчуваю сябе тут вельмі ўтульна.

Тэатр-эксперымент

— У нашым тэатры моцны эксперыментальны пачатак. Можна прыгадаць таленавітых рэжысёраў, якія цудоўна ажыццяўлялі гэтую канцэпцыю. Ігар Казакоў — перспектыўны рэжысёр. Нам пашанцавала, што яго знакамітыя папярэднікі — і народны артыст Украіны Сяргей Яфрэмаў, і заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Алег Жугжда, і іншыя творцы — ставілі ў нас спектаклі. Мы і да сёння сябе пазіцыянуем як эксперыментальны тэатр. Хоць праблема рэжысуры, вядома, стаіць востра. А рэжысура ў тэатры лялек асаблівая.

Сцэна лечыць

— У мяне ніколі не стаяла пытання — хворы я, ёсць тэмпература, няма — заўсёды выходжу на сцэну. За трыццаць гадоў служэння мастацтву не было ніводнага бальнічнага. Праўда, летась адзін усё ж з'явіўся — і тое, вымусілі. Сказалі: «Коля, досыць тваіх подзвігаў».

І сапраўды, калі выходзіш на падмосткі, спадае тэмпература, становіцца лягчэй. Памятаю, у спектаклі «Тры парасяты» трэба было рабіць кульбіт. А ў мяне — страшэнныя ныркавыя колікі. Гледачу ж не растлумачыш. Нічога, прымаў «Но-шпу».

У такіх выпадках трэба альбо мяняць прафесію, альбо ахвяраваць сабою. Вытрымцы і самадысцыпліне навучыла тэатральная школа. Цяпер, гляджу, моладзь спешчаная… Не ўсе вытрымліваюць: хтосьці зрываецца. Мяне ж гэтыя ўменні вельмі выручаюць. Трэба — значыць трэба. Устаў і пайшоў. І працуеш не на дзесяць-пятнаццаць працэнтаў, а на сто. Выкладваюся на рэпетыцыі, бо ведаю: тое, што напрацоўваю цяпер, вернецца ў будучыні. Проста не змагу пасля ніжэй гэтай планкі апусціцца.

Крызісы і ўдзячнасць

— Бываюць і белыя, і цёмныя палосы. Быў перыяд, калі мы, акцёры, не ведалі, куды рухацца далей. Не хапала рэжысёраў. Натуральна, я нармальны чалавек, магу і дэпрэсаваць часам. А на сцэну трэба выходзіць як след, бо цябе чакаюць маленькія гледачы.

Маладым акцёрам стараюся дапамагчы. Аднак парад не даю — гэта справа няўдзячная. Навучыць нельга, а навучыцца можна. Хто жадае павышаць майстэрства — падыходзяць, мы займаемся, нешта раю.

Нядаўна на гастролях у Гродзенскім тэатры лялек сустракаю свайго выпускніка, які вучыўся на драматычным аддзяленні. Кажу: «А чаго ты не ў драмтэатры?» А ён адказвае: «Вы так цудоўна расказалі пра "ляльку", што вырашыў пайсці працаваць менавіта ў гэты тэатр». Вядома, прыемна.

Па жыцці мяне вяла толькі прафесія. Калі прыехаў у Магілёў, адна карэспандэнтка спытала: «Мікалай, што для вас тэатр?» А я ляпнуў першае, што прыйшло ў галаву: «Тэатр — маё жыццё». Аднак гэта на самай справе так. Ён — і мая сям'я, і мае крыўды, і мае расчараванні.

У звычайным жыцці ў мяне мінімум зносін. Сябе добра адчуваю толькі дома, у родных сценах. Я заўсёды ў тэатры — гэта мой дом. Думаю, а можа, трэба было б жыць як звычайны чалавек: стварыць сям'ю, нарадзіць дзяцей? Але, напэўна, звар'яцеў бы. Займаюся тым, што падабаецца.

Дарослыя і лялькі

— Цікавасць дарослай публікі ёсць. Скажу больш — яна нікуды не знікала. Часта прыязджаюць з Мінска. У тым ліку на дзіцячыя спектаклі. У мяне нават была паклонніца. Не ведаю, адкуль прыязджала, але заўсёды прывозіла незвычайныя сувеніры. Увогуле, дарослыя — тыя ж дзеці. Яны хочуць прыйсці і акунуцца ў гэтую атмасферу. Забыцца, што там, на вуліцы. Апынуцца ва ўтульным доміку. Мы стараемся падтрымліваць такую атмасферу ў тэатры. І калі думаеце, што тэатр лялек толькі для дзяцей, то дарэмна.

Надзея ЗУЕВА
Фота Магілёўскага абласнога тэатра лялек

У кожнага свой дзень

У Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў прайшоў паказ монаспектакля «Вершы прыходзяць тады, калі настаюць іх дні». Пастаноўка заснавана на дакументальна-творчай спадчыне Б. Пастарнака, М. Цвятаевай, І. Бродскага.

Рэжысёрам і сцэнарыстам спектакля стала актрыса, мастацкі кіраўнік Тэатра Дакумента (раней Эксперментальная лабараторыя «ТэатральнЫ квадрат») Ганна Суліма. Сёння тэатр працуе на базе Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, а ў яго склад уваходзяць студэнты-рэжысёры. Удзельнікі працуюць над пастаноўкамі, заснаванымі на дакументальным матэрыяле.

У сваіх пастаноўках Ганна Суліма спалучае мастацкую вобразнасць і дакументальную дакладнасць. Падобныя спектаклі не самыя распаўсюджаныя ў тэатральных афішах, таму знаёмства з пастаноўкай прайшло ў атмасферы глыбокай зацікаўленасці.

Дадае інтрыгі і не зусім папулярны жанр монаспектакля. Для недасведчаных гледачоў гэта можа здацца нудным і зацягнутым, але сучасныя монаспектаклі (асабліва ў выкананні Ганны Сулімы) не падобныя на звычайную дэкламацыю вершаў знакамітых і не вельмі паэтаў ці адаптацыю буйных твораў для аднаго акцёра. Гэта своеасаблівы сінтэз музыкі, пантамімы, эмацыянальнай акцёрскай ігры і строгіх афіцыйных звестак. Монаспектакль — няпросты жанр. За кожным рухам акцёра назіраюць дзясяткі гледачоў. Праз міміку і жэсты, інтанацыю і голас трэба перадаць усю глыбіню сэнсу пастаноўкі, велізарны аб'ём тэксту і незлічоную колькасць роляў.

У спектаклі Ганны Сулімы ў НЦСМ «Вершы прыходзяць тады, калі настаюць іх дні» праз вершы, біяграфічныя звесткі і асабістыя лісты паўстаюць вобразы знакамітых паэтаў XX стагоддзя Барыса Пастарнака, Марыны Цвятаевай і Іосіфа Бродскага. Тры асобныя часткі звязаны паміж сабой тонкімі сэнсавымі ніткамі. Пачатак монаспектакля — лірычны музычны уступ, спакой якога рытмічным крокам парушае Ганна Суліма. У яе няма ролі тут, на сцэне, яна — расказчык, праваднік паміж гледачамі і творчасцю вядомых паэтаў. Чорная зала з акцэнтным асвятленнем спрыяла эмацыянальнаму паглыбленню ў асаблівасці жыцця і літаратурнай дзейнасці герояў. Чорнае аддзенне Ганны Сулімы злілося з асяроддзем, і толькі белы твар пасярод цемры займаў усю ўвагу гледачоў.

Першы паэт, пра жыццёвы шлях якога расказала Ганна Суліма, — Барыс Пастарнак.

Жыццё паэта нельга назваць лёгкім: вайна, адмова ў публікацыі рамана «Доктар Жывага», выключэнне з Саюза пісьменнікаў. Пра гэтыя важныя падзеі не забыла нагадаць Ганна Суліма. Яе голас паступова мяняўся са спакойнага і роўнага, калі ішла размова пра дзяцінства і юнацтва, да жорсткага і халоднага, з адценнем металу, калі закранулі тэму ўсеагульнага асуджэння, крытыкі…

Марыну Цвятаеву і Барыса Пастарнака звязвала цеснае сяброўства і знакаміты эпісталярны «раман». Праз лісты, успаміны знаёмых і сяброў Ганна Суліма пазнаёміла гледачоў з гэтай цікавай гісторыяй сяброўства двух талентаў.

Так, паступова апавядальніца перайшла да трагічнага шляху вядомай паэтэсы XX стагоддзя. І зноў кароткі біяграфічны ўступ, які суправаджаўся ўспамінамі Марыны Цвятаевай, яе нататкамі і лістамі да родных і сяброў. Інтанацыі Ганны Сулімы раслі і змяняліся разам з музычным напевам, што нагадвала драматычную сімфонію, якая рэзка абарвалася, падобна жыццю паэтэсы.

Лірычны герой змяняецца, і перад гледачом паўстае творчы шлях Іосіфа Бродскага. На першы погляд здаецца, што ён



ніяк не звязаны з папярэднімі паэтамі. Аднак сцэнарыст прадугледзела гэтае непаразуменне і пазнаёміла публіку з ўрыўкамі з інтэрв'ю Бродскага Свену Біркертсу, дзе прасочваецца шчырае захапленне Марынай Цвятаевай як прафесіяналам і грамадзянінам. «Яе голас пераймаць немагчыма. Прафесійны літаратар заўсёды мімаволі з кімсьці сябе параўноўвае. Але Цвятаева — адзіны паэт, з якім я загадзя адмовіўся супернічаць», — прагучала голасам Ганны Сулімы прызнанне Іосіфа Бродскага.

Лізавета КРУПЯНЬКОВА,
фота аўтара

Майстэрства радавацца жыццю

Да 23 ліпеня ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» можна ўбачыць выстаўку дыпломных работ выпускнікоў факультэта мастацкай культуры кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Творы, прадстаўленыя на суд шырокага гледача, выкананы ў 2023—2024 навучальным годзе.

Марыя Ткачова «Нямесячная ноч».

Дар'я Басько «Іншы свет».

Педагогіка, навука, творчасць

Кафедра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУКіМ больш за дваццаць пяць гадоў паспяхова ажыццяўляе педагагічную, выхаваўчую і навукова-даследчую дзейнасць у галіне народнага мастацтва, падкрэсліваюць у галерэі. Яе выпускнікі займаюцца педагогікай, навукай і, натуральна, творчасцю. Іх прафесійныя абавязкі звязаны з захаваннем і развіццём традыцыйнага народнага мастацтва. Вядома, што кафедра супрацоўнічае з многімі вытворчымі, навуковымі і навучальнымі ўстановамі не толькі краіны, але і блізкага замежжа.

Штогод выпускнікі прэзентуюць работы ў розных відах і напрамках сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Сярод іх — кераміка, маляванка, ткацтва, габелен, батык, аплікацыя саломкай, дрэваапрацоўка. Любая работа, натуральна, — пад кіраўніцтвам выкладчыкаў, вопытных майстроў.

Заняць розум

Сярод тэм, якія цікавяць моладзь, — беларускія традыцыі ды міфы, родныя карані і пошукі шляхоў у будучыню, нерэальны свет, зменлівасць, мімалётнасць часу і адначасова яго застыласць… І ўсё ж у многіх работах праглядаюцца матывы жыццярадаснасці, бадзёрасці, надзеі. Нехта абавязкова захоча дадаць: «І наіўнасці». Сапраўды, вартая тэма для дыскусіі — наіўныя шчасце, весялосць, захапленне ў спробах многіх маладых аўтараў. Наколькі іх прысутнасць у тым ці іншым творы жывапіснага, скульптурнага ці дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва апраўданая, які ўзровень іх наяўнасці дапушчальны і, увогуле, ці гатовы да іх патрабавальны, выхаваны на найдасканалейшых і надзвычай эпатажных узорах сусветнага сучаснага мастацтва глядач — пытанні, здатныя заняць розум. Адна з высноў, да якіх можна прыйсці, між іншым, дакладная і бясспрэчная — работы маладых не абавязаны валодаць выключнай глыбінёй і сур'ёзнасцю. Хаця б таму, што ім часам няма адкуль узяцца, хоць некаторыя, вядома, імкнуцца іх спарадзіць. І тады гэтыя штучнасць, нават фальшывасць, недарэчнасць збіваюць стваральнікаў з уласнага творчага шляху і адпуджваюць гледача, а ён не даруе падману.

Кацярына Карповіч «Сонечны калейдаскоп».

Дарыя Арлова «Мімалётнасць».

Засвоеныя правілы

Між тым увага да наіўнасці ў творчасці маладых зусім не азначае, што яны працуюць ці ставяць за мэту развівацца ў кірунку таго ж інсітнага мастацтва, якое вылучаецца, напрыклад, ігнараваннем акадэмічных норм і выкарыстаннем яркіх і насычаных фарбаў. Прынамсі, па выстаўцы дыпломных работ выпускнікоў факультэта мастацкай культуры кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў гэтага вызначыць немагчыма — усяго па пары твораў ад аўтара. Тут часцей наадварот — многія мастакі, натуральна, імкнуліся прадэманстраваць тое, што засвоілі, тое, на што здольны тыповы майстар. Тым не менш, тэмы, матывы, вобразы іх твораў даюць магчымасць зразумець, чым жывуць маладыя творцы, і галоўнае — пачуць іх унутраны дыялог з самім сабой.

Яўгенія ШЫЦЬКА,
фота аўтара

зваротная сувязь

Абавязкова паглядзіце

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя перадачы.

У выхадныя — праект Навума Гальпяровіча «Сучаснікі. Літаратурныя партрэты». У чацвер — публіцыстычная перадача Настассі Ермалюк «Свет мастацкага слова».

Радыёверсію тэлеперадачы «Суразмоўцы» Навума Гальпяровіча можна паслухаць у нядзелю і панядзелак.

Па буднях у праграме «Літаратурная анталогія» — аповесць Алеся Савіцкага «Карабін». У «Радыёбібліятэцы» з панядзелка да пятніцы — раман Уладзіміра Багамолава «У жніўні сорак чацвёртага».

У праграме «Прачулым радком» у выхадныя — вершы беларускіх пісьменнікаў.

«Літаратурныя гісторыі» пазнаёмяць з апавяданнямі айчынных і замежных аўтараў.

Для юных прыхільнікаў мастацкага слова — праект «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» — казка «Чараўнік краіны ОЗ» Фрэнка Баума. Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для самых маленькіх.

Праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі, навінкамі беларускіх выдавецтваў і зместам новага нумара «ЛіМа».

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

31 ліпеня 70-гадовы юбілей адзначае Наталля Новаш.

31 ліпеня 65-годдзе святкуе Вольга Паршына.

Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае шчырыя спачуванні паэту, празаіку, публіцысту Віктару Гардзею з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці ЖОНКІ.

Выходзіць з 1932 года

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк 18.07.2024 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 707

Друкарня Рэспубліканская ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецт-ва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013
Заказ — 1486
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 24027